Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

КРАСАВІК 6 1933 г. № 76 (4620)

Год выданьня XVI

ПРЫВІТАНЬНЕ ТАВАРЫСТВА СТАРЫХ БАЛЬШАВІКОЎ ТАВ. А. С. БУБНОВУ

Дарагі Андрэй Сяргеевіч! У дзень твайго 50-годзьдзя прэзыдыум таварыства старых бальшавікоў шле табе, вернаму вучню Леніна і саратніку Сталіна, гарачае таварыскае прывітаньне.

30 год свайго жыцьця ты аддаў партыі і рабочай клясе на падрыхтоўку перамогі пралетарскай рэвалюцыі. Пры барбарскім царскім рэжыме, найцяжэйшых умовах падполья, ты прымаў актыўны ўдзел, як рэвалюцыянэр-бавец у стварэньні бальшавіцкай партыі. Тваёй веры ў перамогу сповы пралетарыяту не маглі зламаць ні царскія засьценкі, ні турмы, ні ссылкі. Ты быў і заставаўся верным сваёй партыі.

Твая бальшавіцкая работа шырока вядома ня толькі пралетарыяту буйнейшых прамысловых цэнтраў (Іванава, Масквы, Ленінграду, Харкаву, Саратаву і інш.), але і шматмільённым масам працоўных усяго Савецкага саюзу. У рашаючыя дні сацыялістычнай рэвалюцыі ты быў у першых радох арганізатараў і кіраўнікоў Кастрычніцкай перамогі рабочае клясы.

У пэрыяд грамадзянскай вайны ты быў адным з арганізатараў і правадыроў Чырвонай армії, забясьпечыўшы ёй перамогу над контр-рэвалюцыйнымі бандытамі імпэрыялізму.

Пасьля пераможнага сканчэньня грамадзянскай вайны ты працягваў партыйна-палітычную работу ў Чырвонай армії, як начальнік ПУР'у, па-ленінску выкоўваючы і выхоўваючы байцоў для абароны краіны пралетарскай дыктатуры.

У годы пасьпяховага ажыцьцяўленьня грандыёзных задач першага пяцігадовага пляну народнай гаспадаркі партыя і ўрад паставілі цябе на адказны пост народнага камісара асьветы, дзе ты зьяўляешся стойкім праваднікам марксыцка-ленінскіх установак у галіне пачатковай, сярэдняй і вышэйшай школы. Пад тваім непасрэдным кіраўніцтвам быў пачат і пасьпяхова ажыцьцяўляецца плян усеагульнага пачатковага навучаньня.

Вітаючы цябе, дарагі Андрэй Сяргеевіч, у дзень твайго 50-годзьдзя, прэзыдыум таварыства старых бальшавікоў цьвёрда упэўнен у тым, што ты яшчэ доўгія годы захаваеш для партыі тваю непераможную энэргію рэвалюцыянэра бальшавіка і юнацкі пыл у барацьбе за перамогу сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі і канчатковую перамогу камунізму.

ПРЭЗЫДЫУМ ТАВАРЫСТВА СТАРЫХ БАЛЬШАВІКОЎ.

СЕЛЬКОРЫ, У ПЕРАДАВЫЯ ШАРЭНГІ ЗМАГАРОЎ ЗА СЯЎБУ!

Мы ўступілі ў рашаючы этап веснавой сяўбы. Пачалася ў асобных мясцох паўднёвых раёнаў звышраньняя сяўба. ДНІ АДДЗЯЛЯЮЦЬ НАС АД УСТУПЛЕНЬНЯ Ў МАСАВУЮ ВЕСНАВУЮ СЯЎБУ.

Барацьба за сяўбу гэтага году будзе асабліва напружанай. Кулак і яго агентура напрабуюць яшчэ і яшчэ раз праверыць фронт рабочай клясы і калгаснага селянства, узяць пад свой уплыў асобныя пласты беднякоў і серадняко ў — аднаасобнікаў. Вось чаму неабходна яшчэ большая МАБІЛІЗАЦЫЯ і кансалідацыя УСІХ СІЛ ПАРТЫІ і вакоп яе ўсіх КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ і, у першую чаргу, БЕСПАРТЫЙНАГА АКТЫВУ.

А пра гэты беспартыйны актыў, пра яго перадавы атрад — селькораў, у апошні час у нас часта забываюць. Забываюць тую магутную сілу, той невычарпальны запас творчай ініцыятывы і энэргіі, якія хаваюцца ў селькораўскай армії.

Сапраўды, хіба відзён са старонак многіх раённых дый некаторых цэнтральных газэт жывы селькор, сапраўдны змагар за справу калгаснага будаўніцтва?

Чаму гэта так? Ды таму, што рад газэт надзвычай слаба зьвязаны з калгасамі, калгаснымі масамі, ня бачаць беспартыйнага актыву, не зьвязаны з ім. Чым-жа тлумачыць, што меўшы месца ў Сіроцінскім раёне факт масавага прагулу весновай сяўбы і ўборкі ў мінулым годзе пры наяўнасьці кулацкага «счаковитарельства» ня быў папярэджан праз старонкі раённай газэты? Толькі адсутнасьцю імкнна такой моцнай і глыбокай сувязі газэты з калгаснымі масамі можна гэта вытлумачыць.

«За апошні час у нас, у Харкаўскай вобласьці, нешта слабей стаў чуцён голас сельскага карэспандэнта. Вінаваты, зразумела, мы самі, мы, бальшавікі, кіраўнікі Харкаўскай вобласьці. Асабліва мы за апошні час работу з селькорамі. Вінаваты тут у першую чаргу нашы раённыя, абласныя і цэнтральныя газэты. Не перабудавалі яны сваёй работы з селькорамі. Ня вучылі селькораў уваходзіць глыбей у дэталі і дробязі калгаснага жыцьця і работы, ня ўзбройвалі селькораў уменьнем распазнаваць новую тактыку клясавага ворага» (ПОСТЫШАЎ).

Гэта ацэнка, даная тав. ПОСТЫШАВЫМ на Харкаўскім абласным зьезьдзе рабселькораў, з поўным правам можа быць аднесена і да значнай часткі нашых раённых партарганізацый, раённых і цэнтральных газэт БССР.

Прасьцей гаварачы, за апошні час рад партарганізацый і газэт БССР закінулі сыстэматычную работу з селькорамі. Калі ў гэтым можна менш абвінавачваць такія газэты і арганізацыі, як ДРЫСЕНСКУЮ, ЛЕЗЬНЯНСКУЮ, МАЗЫРСКУЮ, дык з поўным правам можна аднесьці гэты папрок да такіх газэт і арганізацый, як РАГАЧОЎСКАЯ, ЖЛОБІНСКАЯ, ГОМЕЛЬСКАЯ, РЭЧЫЦКАЯ, БАРЫСАЎСКАЯ, ЖЫТКАВІЦКАЯ, ТУРАЎСКАЯ і г. д. Нецярпіма гэта становішча!

ЦК КП(б)Б гэтымі днямі вынес спэцыяльную пастанову аб удзеле друку ў сяўбе, дзе вызначыў канкрэтныя задачы цэнтральных, раённых і мясавых газэт. Неабходна дабіцца, каб кожны пункт гэтай пастановы быў выканан. І ў першую чаргу трэба так паставіць работу з селькорамі, каб яны зьявіліся сапраўднымі перадавікамі барацьбы за сяўбу, лепшымі ўдарнікамі і арганізатарамі ўдарнікаў калгасных вясны.

НЕАБХОДНА НЕАДКЛАДНА, НЯ ТРАЦЯЧЫ НІ МІНУТЫ, ПА-АПЭРАЦЫЙНАМУ ПЕРАБУДАВАЦЦА. Рабселькор павінен стаць ЦЭНТРАЛЬНАЙ ФІГУРАЙ НА СТАРОНКАХ ГАЗЭТ. Работа з рабселькорамі, кіраўніцтва насьценнымі калгаснымі і брыгаднымі газэтамі павінна стаць у цэнтры ўвагі раённага і цэнтральнага друку, і ў першую чаргу ў цэнтры ўвагі раённых і мясавых партыйных арганізацый.

СЕЛЬКОРЫ І НАСЬЦЕНГАЗЭТЫ МОГУЦЬ І АБАВЯЗАНЫ дапамагчы партарганізацыям з посьпехам зьвяршыць падрыхтоўку да сяўбы, дасабраць і заканчыць пратручваньне насеньня, праверыць становішча конскага паголоўя і дабіцца практычнай рэалізацыі дырэктыў партыі і ўраду аб кані, праверыць гатоўнасьць да сяўбы кожнага калгасу, трактара, брыгады, кожнага жняя, сявіна з насеньнем, стайні. ЯНЫ МОГУЦЬ І АБАВЯЗАНЫ з усёй жорсткасьцю і бязьлітаснасьцю выяўляць клясавага ворага і яго агентуру, ставіць пытаньне аб тых, хто «нячысты на руку», каму плывець на лёс калгаснага будаўніцтва, хто ў дзінім нястрымным імкненьні сарваць гэта калгаснае будаўніцтва — будаўніцтва новага сьветлага жыцьця соцень тысяч і мільёнаў калгасьнікаў Беларусі і Усяго Савецкага саюзу, не пагарджае ніякімі сродкамі — ад простых падлапаў і забойстваў да «ціха-сапнай» работы — спраты вінтоў і гаек зд машын, перапальваньня матораў, ломкі радыятараў, калечаньня коняй, узломваньня сьвірнаў, абажаваньня і абмерзаньня калгасьнікаў, раскрадваньня і згнойваньня насеньня і г. д. і г. д. РАБСЕЛЬКОРЫ МОГУЦЬ І АБАВЯЗАНЫ дапамагчы партыі і пад яе кіраўніцтвам калгасным масам ачысьціць калгасы ад клясавых ворагаў і іх агентаў, якія, перапрануўшыся, імкнуцца прапезьці ў склад брыгадзіраў, конюхаў, трактарыстаў, членаў праўленьняў, сейбітаў, пугароў і г. д. з тым, каб разбурыць калгас з сярэдзіны. РАБСЕЛЬКОРЫ МОГУЦЬ І АБАВЯЗАНЫ, бязьлітасна выяўляючы клясавых ворагаў, подыраў і чужаедаў, ісьці ў перадавых радох калгасьнікаў, пад разгорнутымі сьцягамі ўказаньняў тав. Сталіна аб задачах работы на вёсцы, аб тым, каб кожны калгас зрабіць бальшавіцкім.

Неабходна цэнтральны ўпор зрабіць на шырокае ўкараненьне — умацаваньне старых і стварэньне соцень новых — брыгадных насьценгазэт, якія павінны стаць неадлучнай часткай усёй работы брыгады ў барацьбе за сяўбу.

АЛЕ Ў ГЭТЫМ ІМ ПАТРЭБНА МОЦНАЕ, ШТОДЗЕННАЕ, БАЛЬШАВІЦКАЕ ПАДТРЫМАНЬНЕ І КІРАЎНІЦТВА НА ШЫХ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЯЙ, НАШАГА РАЁННАГА І ЦЭНТРАЛЬНАГА ДРУКУ. Брыгадзір, трактарыст, конюх, член праўленьня калгасу, сучоткін, уся маса калгасьнікаў-ударнікаў і ёсьць той калгасны актыў, і ёсьць той селькор, і ёсьць тыя супрацоўнікі сяўгаснага і калгаснага, МТС'аўскага, раённага друку, якія жывым сваім удзелам могуць і абавязаны ставіць самыя надзенныя, самыя канкрэтныя пытаньні калгаснага будаўніцтва, якія хвалююць сотні тысяч калгасьнікаў БССР.

Неабходна значна вышэй УЗЬНЯЦЬ СЬЦЯГ СЕЛЬКОРА — АРГАНІЗАТАРА І ВЫКРЫВАЛЬНІКА, НЯЎМОЛЬНАГА, БЯЗЬЛІТАСНАГА, НЕПАДКУПНАГА КРЫТЫКА як праз друк, так і на месцы ўсіх непададак у нашых калгасах. Неабходна дабіцца, каб гэта крытыка была СУР'ЁЗНАЙ, ПРАЎДЗІВАЙ, ЛЕНІНСКАЙ, каб яна арганізоўвала масы. А гэтага можна дабіцца тады, калі арганізаваныя пад кіраўніцтвам партарганізацыі раённымі, цэнтральнымі і ў першую чаргу мясцовымі насьценгазэтамі, селькоры самі будуць упярэдзе, АСАБІСТЫМ ПРЫКЛАДАМ у калгаснай працы будуць цэмэнтаваць сваю работу ў друку.

«Ваша роля, — сказаў тав. Постышаў на харкаўскім абласным зьезьдзе рабселькораў, — гэта гарачая, бязьлітасная, няўмольная, дзелавая, ленінская крытыка і адначасова з гэтым бальшавіцкая актыўнасьць у вырашэньні практычных задач калгаснага будаўніцтва, прыклад калгаснай працы. Селькор павінен быць застрэльшчыкам і арганізатарам сацыялістычнага спаборніцтва. Узорнай сваёй работай павінен крытыкаваць селькор непададкі ў калгасе, МТС, МТМ, сяўгасе».

А ці няма ў нас такіх лепшых сапраўдных селькораў, застрэльшчыкаў сацыялістычнага спаборніцтва, арганізатараў калгаснай працы? Ці няма ў нас узорных насьценгазэт, самаадданых незамянёных, добрых памочнікаў парт'ячэек?

Вядома, ёсьць. Вазьмеце селькора-ўдарніка, члена рэдкалегіі насьценгазэты калгасу «НОВЫ БЫТ», Касьцюковіцкага раёну, брыгадзіра лепшай калгаснай брыгады № 2 ФРАЛЯНКОВА. Пазнаёмцеся з актыўнай селькоркай-ударніцай, тав. МАКСІМАВАЙ АНТАНІНАЙ, якая недарэмна атрымала ад калгасу «ТРУЖАНІК», Віцебскага раёну, мандат дэлегата на ўсебеларускі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў. Права на мандат ёй дало селькораўскае пяро плюс 495 працадзён, плюс актыўная барацьба супроць кулакоў Лукі Васільпева і Базыля Іванова. Уплядзьцеся ў ІВАШКІНУ ГАННУ, селькорку-ўдарніцу, у якой 8 душ сям'і і якая, ня гледзячы на гэта, выпрацавала 270 працадзён, пасланую калгасам «ЗЬВЯЗДА», Лёзьнянскага раёну, на ўсебеларускі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў.

Іх, такіх ударнікаў-селькораў, адданых справе калгаснага будаўніцтва, — СОТНІ І ТЫСЯЧЫ. Яны — жывы прыклад, жывое пацьвярджэньне тэй вялізарнай сілы, якую тоіць у сабе селькораўскі рух. І іх-жа нашы газэты ў значнай частцы сваёй страцілі, спаба імі кіруюць, закінулі работу з імі.

Але справа, зразумела, ня толькі ў гэтым. Справа і ў саміх селькорах. Аб сіроцінскіх-жа справах, аб ніякай якасьці загатаўляемага ільну і г. д. і г. д. ня было сыгналаў. Бачылі-ж гэта селькоры. А справа ў тым, што КЛЯСАВЫ ВОРАГ ДОБРА РАЗУМЕЕ СІЛУ І ЗНАЧЭНЬНЕ БАЛЬШАВІЦКАГА ДРУКУ, сілу аўтарытэту, які мае добры, перадавы селькор-актывіст. І ЁН ПРАБІРАЕЦЦА Ў СЕЛЬКОРАЎСКІЯ РАДЫ, у склад рэдактараў насьценгазэт.

Вось чаму ПІЛЬНАСЬЦЬ ДА ЧЫСТАТЫ СВАІХ РАДОЎ павінна быць у дзесяткі раз узмоцнена. Як выганяюцца з радоў сумленных калгасьнікаў кулацкія пасьпадкі, так павінны яны выганяцца і з радоў селькораў. ГЭТА КРОЎНАЯ СПРАВА кожнага селькора, кожнай газэты, кожнай партарганізацыі. Завастрыць гэта на нарадах селькораў, завастрыць выразна, так, каб заразіць клясавай пільнасьцю кожнага селькора-ўдарніка — такава задача.

Сяўба гэтага году — асабліва сяўба. Яна павінна ўнесьці яшчэ адзін істотны ўклад у пасьпадоўнае і няўхільнае выкананьне пэўнага любімага праваднра партыі, рабочых і калгасьнікаў тав. СТАЛІНА аб тым, каб зрабіць усіх калгасьнікаў у бліжэйшыя гады заможнымі, КАБ УСЕ КАЛГАСЫ ЗРАБІЦЬ БАЛЬШАВІЦКІМІ. Таму і адказнасьць за гэту сяўбу і ў асаблівасьці друку і селькораў вялікая.

ВЯЛІЗАРНАЯ ЗАДАЧА ЛЯЖЫЦЬ І НА РАБКОРАХ. Аб іх сёньня ня можна ня ісьці гутарка. Рабкоры, фабрычна-заводзкі друк абавязаны ня дэкляраційна, а па-сапраўднаму, па-дзелавому, па-баявому з агнём творчага энтузіязму, са сьвядомасьцю вялізарнай адказнасьці, якая на іх ляжыць, разгарнуць такую работу, каб іх падшэфныя сельсаветы і калгасы аказаліся вартымі сваіх пралетарскіх шэфаў, каб яны вышлі ў перадавыя рады барацьбітоў за сяўбу.

ВА ЎСЁЙ БАРАЦЬБЕ ЗА СЯЎБУ ГЭТАГА ГОДУ НІ НА АДНУ ХВІЛІНУ НЕЛЬЗЯ ЗАБЫВАЦЬ І АДНААСОБНІКА. АСАБЛІВА ВАЖНА ГЭТА ТАМУ, ШТО АДНААСОБНІК У АПОШНІ ЧАС ЧАСТА ВЫПАДАЕ СА СТАРОНАК РАЁННАГА І ЦЭНТРАЛЬНАГА ДРУКУ. НЕАБХОДНА ПАВЯРНУЦЬ УВАГУ СЕЛЬКОРА ДА АДНААСОБНАЙ ГАСПАДАРКІ, ДАПАМАГЧЫ ЁЙ, ДАЦЬ МЕСЦА Ў КАЛГАСНАЙ ГАЗЭЦЕ, ЗМАГАЦЦА ЗА ПОСЬПЕХІ СЯЎБЫ СЯРОД АДНААСОБНІКАЎ — БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ.

У сваёй адозве ўсебеларускі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў заявіў:

«І да вас, таварышы рабселькоры, наша слова. Друк—магутная зброя ў барацьбе за ўмацаваньне калгаснага ладу. Будзем мацаваць наш друк у кожным калгасе, у кожнай брыгадзе. Рабселькор, не баючыся сапсаваць добрасуседзкіх адносін з кулаком і яго агентурай, павінен самым рашучым чынам змагацца супроць злаўдзеяў, подыраў, прыхлябальнікаў, пульгаёў, супроць зьяў расхлябанасьці і парушэньня калгаснай дысцыпліны, адкрываючы бязьлітасны агонь па тых, хто раскрадзе насеньне, хто злачынна адносіцца да каня, да трактара, хто больш адпачывае, чым працуе.

Разгорнем праз раённыя калгасныя газэты сацыялістычнае спаборніцтва на лепшае правядзеньне веснавой сяўбы».

Зьезд абвясьціў САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА З ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЬЦЮ. У спаборніцтве ўключыўся і друк, і рабселькоры БССР. Іх баявая пачэсная задача — ня здаць, ва ўпартай непахісной барацьбе на калгасных палёх веснавой сяўбы завалаваць сьцяг сацыялістычнага пярэшынства.

РАБОТА З СЕЛЬКОРАМІ Ў БЕЛАРУСІ ПАВІННА З АСАБЛІВАЙ СІЛАЙ І РАЗМАХАМ АЖЫВІЦЦА. Патрэбна ў некалькі раз пашырыць той размах, які быў у пэрыяд падрыхтоўкі і правядзеньня ўсебеларускага зьезду рабселькораў і конкурсу «Праўды».

АДНААСОБНІКІ-ЗАУТРАШНІЯ КАЛГАСЬНІКІ

МАЦНЕЙ УДАР ПА НЕДААЦЭНЦЫ АДНААСОБНАГА СЭКТАРУ, БОЛЬШ УВАГІ, БОЛЬШ КАНКРЭТНАЙ ДАПАМОГІ ПРАЦОЎНЫМ АДНААСОБНЫМ ГАСПАДАРКАМ У ПРАВЯДЗЕНЬНІ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ

Сакратару Жлобінскага РК КП(б)Б тав. Плешакову Старшыні райвыканкому т. Тамашэўскаму

Шлем гарачае брацкае прывітаньне бальшавікам і калгасьнікам вашага раёну. Сьпешнай загатоўкай насеннай бульбы вы даказалі на справе салідарнасьць працоўных народаў Савецкага саюзу, гатоўнасьць па-бальшавіцку змагацца за пасьпяховае правядзеньне веснавой сяўбы першага году другой пяцігодкі.

САКРАТАР ХАРКАЎСКАГА АБЛПАРТКОМУ САПАЎ.

З ПАСЕЎНАГА ФРОНТУ

НЯМА НІ АДНАГО ПРАГУЛУ

ЕЛЬСК, 4. (НА ШКАР.).

З КОЖНЫМ ДНЁМ УСЁ НОВЫЯ І НОВЫЯ КАЛГАСЫ ПРЫСТУПАЮЦЬ ДА ПАЛЯВЫХ РАБОТ. У РАЁНЕ РАЗГОРТВАЕЦЦА ВОРЫВА І ЗВЫШРАНЬНЯ СЯЎБА.

СЬЛЕДАМ ЗА КАЛГАСАМІ «ЧЫРВОНЫ ПУЦІЛАВЕЦ», «КАМУНАР», «ДЗЕСЯТЫ ЗЬЕЗД САВЕТАЎ» І «СЕРП І МОЛАТ», ЯКІЯ ПЕРШЫМІ РАЗГАРНУЛІ ВОРЫВА І ПРЫСТУПІЛІ ДА ЗВЫШРАНЬНЯЙ СЯЎБЫ ЯРАВЫХ, ВЫШЛІ Ў ПОЛЕ ТАКСАМА КАЛГАСЫ МАХНАВІЦКАГА, СТАРАВЫСОЦКАГА І ЕЛЬСКАГА СЕЛЬСАВЕТАЎ.

31 САКАВІКА ПРЫСТУПІЎ ДА ЗВЫШРАНЬНЯЙ СЯЎБЫ КАЛГАС «ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА». У ПЕРШЫ-Ж ДЗЁНЬ КАЛГАСЬНІКІ ЗАСЕЯЛІ 2,25 ГА. ЗВЫШРАНЬНЯЯ СЯЎБА АЎСА Ў КАЛГАСЕ «ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА» ПРАВЕДЗЕНА 2 КРАСАВІКА.

КАЛГАС ДОБРА ПАДРЫХТАВАЎСЯ ДА ПАЛЯВЫХ РАБОТ. АБ ГЭТЫМ СЬВЕДЧАЦЬ ПЕРШЫЯ ДНІ РАБОТЫ Ў ПОЛІ. УСЕ КАЛГАСЬНІКІ АКУРАТНА ВЫХОДЗЯЦЬ Ў ПОЛЕ. НЯМА НІ АДНАГО ПРАГУЛУ.

***

ЛЮБАНЬ, 4 (ПА ТЭЛЕФОНУ).

У ЛЮБАНЬСКІМ РАЁНЕ ПАЧЫНАЕЦЦА ЗВЫШРАНЬНЯЯ СЯЎБА. ПЕРШЫМ ВЫШАЎ У ПОЛЕ КАЛГАС «ЧЫРВОНЫ СЬЦЯГ», ЯКІ ЎЖО ЗАСЕЯЎ 4 ГА.

РК КП(б)Б, РВК.

***

УВАГА ЯКАСЬЦІ СЯЎБЫ

ВОРША, 5. (ПА ТЭЛЕФОНУ).

ПЕРАДАВЫЯ КАЛГАСЫ АРШАНШЧЫНЫ ПАЧАЛІ ЗВЫШРАНЬНЮЮ СЯЎБУ ЯРАВЫХ. КАЛГАСЫ «БАЛЬШАВІК» І «НОВАЯ ЗОРКА», МАШКАЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ 26 САКАВІКА ЗАСЕЯЛІ 1,5 ГА ІЛЬНУ.

29 САКАВІКА ПАЧАЛІ ЗВЫШРАНЬНЮЮ СЯЎБУ КАЛГАСЫ «ПЕРАМОГА», «АБ'ЯДНАНЬНЕ» І «ДРУГАЯ ПЯЦІГОДКА», ШЫБЕЦКАГА СЕЛЬСАВЕТУ. ЗА АДЗІН ДЗЕНЬ ГЭТЫЯ КАЛГАСЫ ЗАСЕЯЛІ З ГЭКТАРЫ ІЛЬНУ. ПАЧАЛІСЯ ВОРЫВА І ЗВЫШРАНЬНЯЯ СЯЎБА І Ў РАДЗЕ ІНШЫХ СЕЛЬСАВЕТАЎ.

У КАЛГАСАХ ШЫБЕЦКАГА СЕЛЬСАВЕТУ ВЯЛІКАЮ ЎВАГУ ЗЬВЯРНУЛІ НА ЯКАСЬЦЬ СЯЎБЫ, НА ПАДБОР ГЛЕБЫ. ЯК ПРАВІЛА, ЛЁН ВЫСЯВАЎСЯ ЎРУЧНУЮ, У ДОБРАЕ НАДВОР'Е НА ДОБРА АПРАЦАВАНЫХ З ВОСЕНІ ВУЧАСТКАХ, НА РОЎНЫХ МЯСЦОХ.

НЕЛЬГА НЕ АДЗНАЧЫЦЬ, ШТО ЗВЫШРАНЬНЯЯ СЯЎБА ПРАХОДЗІЦЬ Ў РАЁНЕ БЕЗ НЕПАСРЭДНАГА КІРАЎНІЦТВА З БОКУ ЗЯМЕЛЬНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ. РАЙЗЕМАДДЗЕЛ ЗУСІМ НЕ КІРУЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕМ ЗВЫШРАНЬНІХ ПАЛЯВЫХ РАБОТ.

КАЛГАСЫ АРШАНШЧЫНЫ ЗАСЕЮЦЬ У ЗВЫШРАНЬНІЯ ТЭРМІНЫ КАЛЯ 30 ГА ІЛЬНУ І 5 ГЭКТАРАЎ АЎСА

СЯЎБА РАЗГОРТВАЕЦЦА

СЛУЦАК, 5 (ПА ТЭЛЕГРАФУ)

ЗВЫШРАНЬНЯЯ СЯЎБА РАЗГОРТВАЕЦЦА. КАЛГАСЫ АДЗІН ЗА АДНЫМ ВЫХОДЗЯЦЬ НА ПАЛЯВЫЯ РАБОТЫ. КАЛГАС ІМЯ РОЗЫ ЛЮКСЭМБУРГ ЗАСЕЯЎ 14 ГЭКТАРАЎ АЎСА.

У АМГАВІЦКІМ СЕЛЬСАВЕЦЕ ЗВЫШРАНЬНЯЯ СЯЎБА ПАЧАЛАСЯ 31 САКАВІКА. КАЛГАС «МОПР» ЗАСЕЯЎ 3 ГЭКТАРЫ АЎСА, КАЛГАС ІМЯ КАРЛА ЛІБКНЭХТА — 2 ГЭКТАРЫ І КАЛГАС «КРАІНА САВЕТАЎ» — 3 ГЭКТАРЫ АЎСА. ГЭТЫ-Ж КАЛГАС УЖО ЗАСЕЯЎ 4 ГЭКТАРЫ ЯРАВОГА ЖЫТА.

У ШЫЧЫЦКІМ СЕЛЬСАВЕЦЕ ПРЫСТУПІЎ ДА СЯЎБЫ КАЛГАС «УСХОД». СЕЛЬСАВЕТ АРГАНІЗУЕ АПЭРАЦЫЙНАЕ КІРАЎНІЦТВА ПРАВЯДЗЕНЬНЕМ ЗВЫШРАНЬНІХ ПАЛЯВЫХ РАБОТ. У ПЕРШЫ-Ж ДЗЕНЬ СЯЎБЫ СТАРШЫНЯ СЕЛЬСАВЕТУ ТАВ. КАЛЯДА НЕПАСРЭДНА ЗНАХОДЗІЎСЯ НА КАЛГАСНЫХ ПАЛЁХ, ПРАВЯРАЮЧЫ АРГАНІЗАЦЫЮ І ХОД ПАЛЯВЫХ РАБОТ.

ЦАЦКАЮЦЦА З САБАТАЖНІКАМІ

ГАРАДОК, 4.

50 проц. яравога кліну прыпадае ў Гарадоцкім раёне на аднаасобны сэктар. Ёсьць сельсаветы, як Бискатаўскі і Балецацкі, дзе аднаасобныя гаспадаркі складаюць 70—75 проц. Гэта абавязвае як райземаддзел, так і сельсаветы ўсямерна дапамагаць аднаасобнікам у падрыхтоўцы да сяўбы, кіраваць аднаасобным сэктарам.

Што-ж мы маем па справе? Райземаддзел (загадчык тав. Шнэйдэр) фактычна ня мае ніякага ўяўленьня аб падрыхтоўцы аднаасобнікаў да сяўбы. Самі работнікі райземаддзелу прызнаюць, што зводкі аб рамонце інвэнтару і ачыстцы насеньня па аднаасобным сэктары толькі... «прыблізныя».

Чаго варта такое кіраўніцтва можна ўяўніцца на прыкладзе Вайханскага сельсавету. Тут аднаасобны сэктар складае 85 проц. На 25 сакавіка аднаасобнікі ссыпалі ў страхфонды толькі 80 проц. збожжавых і 47 проц. ільну. Гэта паводле весткі сельсавету. Як ідзе ачыстка насеньня — сельсавет ня ведае. Рамонт інвэнтару зусім не разгорнут. З 398 плугоў адрамантавана 44, калёс з 211 адрамантавана 21.

Замежнікі Трыфанаў, Аванькеў, Бывалаў, Шырын адмаўляюцца прыняць пасеўныя пляны і сабатуюць падрыхтоўку да сяўбы. Сельсавет-жа ні аднаго з гэтых сабатажнікаў не прыцягнуў да адказнасьці. Кіраўнікі сельсавету проста цацкаюцца са зрыўшчыкамі веснавой сяўбы.

Палітычна-масавай растлумачальнай работы сярод аднаасобнікаў сельсавет зусім не вядзе.

Або возьмем Бяскатаўскі сельсавет. Тут, як мы ўжо адзначалі, аднаасобнікі складаюць 75 проц. Ня гледзячы на гэта, аднаасобнікі ігнаруюцца. Сельсавет ня ведае, як ідзе рамонт інвэнтару ў аднаасобным сэктары, колькі ўжо адрамантавана плугоў, бран і г. д. Ссыпка страхавых фондаў яшчэ ня скончана, збожжавых замест 208 цэнтнэраў ссыпана толькі 152, бульбы замест 417 цэнтнэраў ссыпана 108, ільну замест 40 ссыпана 29 цэнтнэраў. Ня лепш і з ачысткай насеньня. Як ідзе сартыроўка насеньня, як працуюць збожжачышчальныя абозы — сельсавет ня ведае.

Райком КП(б)Б зусім не рэагуе на гэтыя факты агіднейшага ігнараваньня аднаасобнікаў.

В. Ч.

„НЕЯК-ЖА ССЫПАЮЦЬ"...

ПЛЕШЧАНІЦЫ, 4.

Калі ў калгасах Зарэцкага сельсавету ідзе напружаная падрыхтоўка да выхаду ў поле, дык пра аднаасобны сэктар у гэтым сельсавеце зусім забылі. Аднаасобнік выпаў з пляну падрыхтоўкі да сяўбы.

Зарэцкі сельсавет злачынна марудзіць з давядзеньнем пасеўных заданьняў да аднаасобніка. У першы раз далі няправільныя, пераблытаныя пляны па аўсу і вікі. Пасьля пачалі ўносіць зьмены, ды так, што яшчэ больш заблыталі пасеўныя пляны.

Старшыня сельсавету Вайцяхоўскі ня ведае наколькі выканан плян ссыпкі насенных і страхавых фондаў па аднаасобным сэктары.

— Неяк-жа ссыпаюць, — спакойна заяўляе Вайцяхоўскі. Самацёк у гэтай рабоце прывёў да таго, што па аднаасобным сэктары ссыпана толькі 50 цэнтнэраў — 70 проц. пляну.

Зусім дрэнна з адводам зямлі. Многія аднаасобнікі ня ведаюць дзе яны будуць сеяць. У сельсавеце няма ніякага ўліку таго, якія вучасткі адведзены аднаасобнікам і ў якім нумэце.

Загадчык райземаддзелу Шэлег ня прыняў ніякіх мер, каб прымусіць сельсавет узяцца за падрыхтоўку да сяўбы па аднаасобным сэктары.

Н.

ЗВОДКІ І САПРАЎДНАСЬЦЬ

БАБРУЙСК, 5. (Наш кар.).

З шырокіх палёў райземаддзелаўскай зводкі аб ссыпцы насенфондаў так і дыша спакоем. Зярнеш у графы збожжавых, бульбы, траў,—усюды 100 проц. і нават больш.

Як быццам усё ў парадку, і турбавацца няма чаго.

А на справе... За аптымістычнымі лічбамі раённай зводкі хаваецца пагроза поўнага зрыву ссыпкі насенфондаў.

Загадчык райземаддзелу тав. Патапенка ў адказ на пытаньне аб ходзе падрыхтоўкі да сяўбы, сумна паціскае плячыма:

— Насеньня ў раёне быццам і хапае, фонды балянсуюцца.

У той-жа час ёсьць дзесяткі калгасаў, дзе насеньне ня ссыпана.

І сапраўды, амаль усе калгасы замест нехапаючых культур ссыпалі іншыя культуры для абмену. Але ніхто ў раёне не паклапаціўся аб тым, каб арганізаваць гэты абмен; каб скончыць ссыпку па ўсіх культурах.

Асабліва востра дае сябе адчуваць недахват насеньня паасобных траў, хаця ў агульнай графе зводкі фігуруе лічба ў 100 проц. Не хапае такой культуры, як канюшына. Яе патрабуецца 260 цэнтн., а ёсьць толькі 48 цэнтн. Затое ёсьць лішкі вікі. Для пакрыцьця дэфіцыту канюшыны трэба наладзіць міжраённы абмен насеньнем траў. Але тут справа натыкаецца на інэртнасьць і бязьдзейнасьць мясцовых арганізацый.

Вось прыклад. Па суседзтву, па адлегласьці 4-5 кілёмэтраў знаходзяцца два калгасы — імя Молатава і «Чырвоная зьвязда». У першым не хапае лубіну, але ёсьць лішкі яравога жыта. А ў другім наадварот — ёсьць лішкі лубіну, а не хапае яравога жыта. Трэба толькі дагаварыцца аб абмене насеньня і пытаньне будзе вырашана. Аднак, кожны з гэтых калгасаў ня ведае, што робіцца ў суседа, якога насеньня ў яго не хапае. І ідуць часта прадстаўнікі калгасаў за дзесяткі кілёмэтраў шукаць насеньня, траціячы безьліч часу бяз усякай карысьці.

Рымавіцкі сельсавет, дзе знаходзяцца гэтыя калгасы, занят чым хочаце толькі не арганізацыяй абмену насеньня. Упаўнаважаныя РК таксама ў баку ад гэтай справы.

Райком і РВК спадзяюцца на завоз насеньня і таму — спакойна склалі рукі... Адным словам, чакаюць дапамогі з цэнтру, а самі абмену насеньня не арганізуюць!

П. Ч.

ПАРАДНЫ ВЫЕЗД АШУКАНЦАЎ

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Прыгарадная гаспадарка ЗРК заводу імя Сталіна павінна ў гэтым годзе засеяць 296 га яравых культур і 35 гародніх.

Для таго, каб поўнасьцю засеяць увесь яравы клін, у гаспадарцы не хапае 30 тон бульбы і 5 т. аўса. Насеньне аўса дагэтуль не ачышчана і праз трыер не прапушчана. Замест 5.910 тон гною вывезена 3.452.

З 57 коняй каапгасу, 26 патрабуюць доўгатэрміновага адпачынку.

Дырэктар гаспадаркі тав. Яфрэмен ка, сакратар ячэйкі Окс і старшыня рабочкому Валуканка, ведаючы аб сур'ёзных прарывах у падрыхтоўцы да сяўбы, палцам аб палец ня стукну хі, каб мабілізаваць рабочых каапгасу на хутчэйшае завяршэньне падрыхтоўкі.

Для таго, каб замазаць вочы завадкіраўніцтву, каб ашукаць рабочую грамадзкасьць, яны арганізавалі парадны выезд у поле.

На выезьдзе прысутнічалі сакратар парткому заводу тав. Гольдзін і старшыня заўкому тав. Шмідт. У гэты-ж дзень гаспадарку наведаў прыхаўшы з Менску старшыня ЦП саюзу гарбароў тав. Рохін. Яны ня ўбачылі прарываў, аб апошніх работнікі каапгасу і не заікнуліся. Госьці глядзелі толькі на тое, што ім хацеў паказаць дырэктар фермы тав. Яфрэменка. Яны засталіся вельмі задаволенымі і падзявілі адміністрацыі за добрую падрыхтоўку да сяўбы.

Толькі пасьля таго, як пра гэты факт даведаліся ў райкоме,

Грузы веснавой сяўбы дастаўляць на палі без перабояў

ДА СУРОВАЙ АДКАЗНАСЬЦІ ВІНАВАТЫХ У ЗАТРЫМАНЬНІ ПАСЕЎНЫХ ГРУЗАЎ

Яшчэ 24 студзеня загадам наркаматаў шляхоў зносін, цяжкай прамысловасьці, земляробства і саўгасаў была ўстаноўлена адказнасьць як па лініі чыгунак, так і адпаведных наркаматаў за поўную і своячасовую адгрузку і дастаўку на месца сяўбы пасеўных сельска-гаспадарчых грузаў. Загад абавязваў начальнікаў чыгуначных раёнаў пад іх асабістую адказнасьць забясьпечыць пасеўныя перавозкі рухомым складам, недапускаць ніякіх затрымак як маршрутаў, так і асобных вагонаў, узяць выгрузку і прасоўваньне гэтых грузаў пад штодзенны дыспэтчарскі нагляд і інш. Былі даны ўказаньні аб гэтым і па лініі ЦК КП(б)Б і партарганізатара шляхоў зносін тав. Амосава.

Здавалася-б, дырэктывы ясныя. Чыгуначныя партыйныя, прафсаюзныя і гаспадарчыя арганізацыі абавязаны гэтыя дырэктывы практычна, па-бальшавіцку рэалізаваць.

Што мы маем на справе?

Малюнак даволі сумны. Па жэлізнічаны выпадкі затрымак пасеўгрузаў на цэлыя дні, залежаў, прастояў, непадач вагонаў, засьлак і г. д. Гэта назіраецца ва ўсіх без выключэньня раёнах. Зараз пачаліся масавыя перавозкі сельска-гаспадарчых грузаў і гаручага. Сяўба распачалася. Кожная малейшая затрымка — удар па сяўбе. Гэтага, як відаць, не зразумелі чыгуначныя арганізацыі.

Ці могуць быць хоць чым-небудзь апраўданы факты, якія паведамляюцца ў карэспандэнцыі з **Віцебску?** Сотні гадзін прастояў цыстэрнаў, вагонаў з пасеўнымі грузамі! Гэта ў той час, калі кожная хвіліна работы цыстэрны і вагона павінна быць на строгім уліку, калі па многіх МТС не хапае гаручага, калі чыгунка адчувае недахват у рухомым складзе.

А чаго варта работа віцебскай таварнай канторы? У адказнейшы момант, калі патрабуецца выключная выразнасьць у рабоце апарату, там існуе злачынная безгаспадарчасьць, сыстэма няправільных разьметак вагонаў, засьлакі грузаў і г. д.

Як, напрыклад, назваць такі факт, калі 5 блёкаў, пагружаныя Расонскай МТС у адрас Віцебскай ачковай фабрыкі, **Полацкай** станцыяй засланы ў Смаленск? Што гэта, нядбайнасьць ці шкодніцтва?

Ня лепш справа і ў **Ворпы, Менску** і інш. станцыях. На станцыі Ворпа цыстэрна № 225.386 прастаяла 21 гадзіну, 22 сакавіка вагон з пасеўгрузамі прастаяў 16 гадзін. У той-жа дзень са станцыі Ворпа быў адпраўлен для Ветрынскай МТС блёк для трактара «ХТЗ», які прыбыў на месца прызначэньня праз... 10 дзён. Пааршанску гэта называецца «па-за чарговае прасоўваньне пасеўных грузаў». Даволі вялікія затрымкі вагонаў на станцыі Ворпа з прычыны зусім нязначных тэхнічных няспраўнасьцяй. Так, вагон № 929.379 прастаяў 64 гадзіны, вагон № 511.733—двое сутак і г. д., хоць для рамонту іх патрабаваўся зусім нязначны час. Ганебна пастаўлена работа на таварным двары Ворпа-ўсходняя. Там пасеўныя адпраўленьні пралежваюць па 200 гадзін і больш.

Надзвычай дрэнна з улікам пасеўных грузаў. Як у Віцебску, так і ў Ворпы ўлік пераходзіць з рук у рукі. У Ворпы книга ўліку зусім знікла. Шмат вагонаў з пасеўгрузамі аказалася незарэгістраванымі.

У таварнай канторы ст. **Менск** да гэтага часу ня вылучан спэцыяльны чалавек, які-б займаўся пытаньнем прасоўваньня пасеўных грузаў. Пагрузка і выгрузка робіцца ў звычайным парадку, як і другарадных грузаў.

Трэба бязьлітасна ўдарыць па канкрэтных вінаватых затрымак. Нельга цацкацца з тымі, хто сваімі дзеяньнямі падрывае вялікую справу—посьпех бальшавіцкай сяўбы другой пяцігодкі. Да самай суровай адказнасьці іх! Рашуча трэба выкрыць твар клясавага ворага, які пралез на транспарт і шкодзіць нашай справе. Клясавы вораг у першую чаргу імкнецца працягнуць свае рукі, каб затрымаць пасеўныя вагоны, цыстэрны, каб пашкодзіць веснавой сяўбе. Адсекці гэтыя рукі, прагнаць з транспарту ахвосьце кулацтва і контр-рэвалюцыі — баявая задача чыгуначных арганізацый, усяго чыгуначнага пралетарыяту.

Нельга абыйсьці і таго факту, што кліентура ва многіх выпадках незакуратна атрымлівае пасеўгрузы. **Аршанская МТС** прыняла трактарныя часткі толькі праз 10 дзён. Пастолькі-ж пралежваюць на станцыі грузы і **Аршанскага сьвіноводтрэсту.** На таварнай станцыі **Менск** ляжаць сельска-гаспадарчыя грузы для саўгасу «Лошыца» з 6 сакавіка. **Дзяржынская МТС** не забрала розныя машынныя часткі, якія прысланы з Гомсельмаша яшчэ... у верасьні мінулага году.

У бягучую веснавую сяўбу на чыгуначную партарганізацыю кладзецца выключная адказнасьць. На гэтым вучастку яна трымае экзамэн сваёй здольнасьці на справе змагацца за генэральную лінію партыі. Для таго, каб заваяваць перамогу, трэба мабілізаваць масы, усе чыгуначныя арганізацыі, трэба ўзьняць справу барацьбы за ўдарнае прасоўваньне пасеўных на прынцыпова-палітычную вышыню. Партыйны і грамадзкі кантроль павінен існаваць не на паперы, а практычна праводзіць работу на кожнай станцыі, на кожным пункце пагрузкі і выгрузкі. Трэба перавесьці работу па пагрузцы, адпраўцы, разгрузцы сельска-гаспадарчых грузаў на рэйкі сацспаборніцтва. Вышэй пралетарскую працоўную дысцыпліну!

Нізавыя, раённыя, чыгуначныя і мясцовыя газэты абавязаны ўзяць пад пільны нагляд пасеўныя грузы. Яны не павінны прайсьці міма ніводнага факту малейшага затрыманьня пасеўных грузаў. Барацьба не наогул, а з канкрэтнымі выпадкамі, канкрэтнымі вінаватымі — у гэтым іх задача.

Апошняя пастанова ЦК КП(б)Б абавязала трыкутнікі эксплёатацыйных раёнаў, гаркомы і райкомы КП(б)Б і райпрафсаветы ўзмацніць апэрацыйнае кіраўніцтва работай па прасоўваньні цыстэрнаў з гаручым, вагонаў з сельска-гаспадарчымі матар'ялямі і г. д. Між тым штодзённага кантролю за гэтым яшчэ няма. Няма яго і з боку трыкутнікаў станцыі. Час пакласьці гэтаму канец. Партыя ня можа цярпець і не пацерпіць герояў славесна-дэкларацыйнай шуміхі, саноўна-панскага кіраўніцтва важнейшым вучасткам,—дастаўкай на палі с.-г. машын, гаручага і інш, які ў агульнай сыстэме адыгрывае важнейшую ролю ў вырашэньні посьпехаў сяўбы

13 ЦЫСТЭРН ПРАСТАЯЛІ БОЛЬШ 200 ГАДЗІН

Своячасовая дастаўка на сацыялістычныя палі гаручага, сельска-гаспадарчых машын, зап. частак, мінэральнага ўгнаеньня і інш. — адказнейшая і гаварная задача чыгуначнага транспарту.

Ад вырашэньня яе ў значнай меры будзе залежыць посьпех сяўбы.

Як Віцебск вузел — буйнейшы на МББ чыгунцы — спраўляецца з гэтай работай?

Праз станцыю Віцебск штодзенна праходзіць шмат пасеўных грузаў. Просты абавязак кіраўніцтва станцыі не дапускаць ні адзай хвіліны затрыманьня іх, хутка грузіць і разгружаць, бесьперабойна прасоўваць да месца прызначэньня. Па гэтым пытаньні ёсьць зусім выразныя дырэктывы ЦК КП(б)Б і НК шляхоў зносін. Аднак, на Віцебскім вузле сапраўднай бальшавіцкай барацьбы за рэалізацыю гэтых дырэктыў няма. Прастої пасеўных грузаў — даволі частыя выпадкі.

25 сакавіка па віне кіраўніцтва станцыі **13 цыстэрн прастаялі па 19 гадзін кожная.** За такое злачынае затрыманьне цыстэрн ніхто не панёс заслужанага пакараньня, ня гледзячы на ўказаньне ЦК КП(б)Б аб строгай адказнасьці за малейшае іх затрыманьне. З 21 сакавіка адна цыстэрна з нафтай не разгружалася на працягу больш 2-х сутак па віне экспэдытара Саюзтрансу **Рэўзіна.**

На вузле ёсьць таксама недадачы вагонаў пад пасеўныя грузы і прастої ў гружаным відзе. У большасьці яны выклікаюцца дрэннай работай кіраўніцтва станцыі і таварнай канторы.

17 сакавіка, напрыклад, у 10 гадзін. да пакгаўзу № 2 Саюзтрансу павінна было быць падана 6 вагонаў для пагрузкі пасеўных грузаў. Іх падалі толькі ў 14 гадзін, і то праз 20 мінут, па загаду загадчыка таварнага двара **Арцем'ева** забралі ненагру жаныя. 18 сакавіка ў 10 гадзін раніцы да таго-ж пакгаўзу—павінна было быць падана 14 вагонаў для тэй-жа моты, але ў патрэбны час падалі толькі 4 вагоны, а астатнія 10 — праз 5 гадзін.

Вагон № 383149 замест падачы да каменнай рампы, з прычыны няправільнай разьметкі быў падан да сараю № 10.

Аб адсутнасьці выразнай работы, аб злачынай блытаніне на станцыі сьведчыць факт, які меў месца 26 сакавіка, калі зусім выпадкова былі знойдзены 3 вагоны з пасеўнымі грузамі, якія прыбылі яшчэ 24 сакавіка на станцыю Віцебск і павінны былі быць накіраваны на бліжэйшую станцыю Лёзна. Двое сутак тры вагоны з важнейшымі грузамі для веснавой сяўбы блыталіся па шляхох, а кіраўніцтва станцыі лічыла, што ў яе ўсё ў парадку.

Факты паказваюць, што кіраўніцтва вузла не зразумела ўсёй адказнасьці, якая кладзецца на яго за своячасовую дастаўку пасеўных грузаў калгасам і вёскам. Маса не мабілізавана вакол гэтага пытаньня. Створаныя раней брыгады грамадзкага кантролю прасоўваньня грузаў не працуюць, яны фактычна развяліся, бо імі ніхто ня кіруе. Аддзел эксплёатацыі раёну (**Галкін**), кіраўніцтва станцыі (**Мельнікаў**) абмежаваліся фармальным выкананьнем дырэктыў партыі і ўраду: завялі кнігу, дзе рэгіструецца праходзячы пасеўны груз, і на гэтым супакоіліся. Характэрна, што нават і гэтыя кнігі вядуцца безадказна, даручаюцца розным асобам; аналізу прычын прастояў пасеўных грузаў ніхто ня робіць і канкрэтных мерапрыемстваў па барацьбе з прастоямі не праводзіцца.

Так «змагаюцца» за своячасовую дастаўку пасеўных грузаў на Віцебскім вузле. Неабходна напомніць кіраўніцтву вузла пастанову ЦК КП(б)Б, дзе сказана: «За кожны выпадак затрыманьня цыстэрн, маруднага прасоўваньня пасеўных грузаў, гаручых і змазачных матар'ялаў, а таксама за несваячасовую разгрузку цыстэрн, вінаватыя будуць прыцягнуты да суровай партыйнай і крымінальнай адказнасьці».

Ангоўскі.

ЗАСТАЛІСЯ ЛІЧАНЫЯ ДНІ

НАГНАЦЬ ПРАПУШЧАНАЕ, ПА-БАЛЬШАВІЦКУ СКОНЧЫЦЬ КАЛДАГАВОРНУЮ

„Нашы нормы павінны быць выкананы"

Вялікія зьмены ўнесьлі ў новы калдагавор па найбольш важнейшым вучасткам рабочыя заводу «**Бальшавік**», узьняцьцё прадукцыйнасьці працы і паляпшэньне якасьці прадукцыі.

Разгортваньне сацыялістычных форм працы, асабліва брыгад гасразрахунку, мэханізацыя і рацыяналізацыя вытворчасьці на многіх працэсах, стварыла неаддаведнасьць паміж фактычнай выпрацоўкай і існуючымі ў практыцы да гэтага часу нормамі.

Заводзкае ТНБ вывучыла гэты разрыў і ўзяла фактычную выпрацоўку за студзень месяц усіх брыгад, і вывела для іх сярэдні процант прапрацоўкі заданьня. Аказалася, што на расьцяжцы па белях нормы перапрацоўваюцца ў сярэднім на 57 проц., па лашчэньні — 47 проц., шлягоўцы — 46 проц., адвалажцы на 44 проц. і г. д.

Зусім зразумела, што гэта ўжо ўстараўшыя, яўна зьніжаныя нормы, якія ня могуць адпавядаць патрабаваньням першага году другой пяцігодкі. Такім-жа чынам са зьніжанымі нормамі было выяўлена сорак працэсаў, што складае 60 проц. іх агульнай колькасьці.

На сёнешні дзень усе яны перагледжаны, і ўжо даны новыя нормы. Рад перадавых брыгад не чакаючы хранометражу самі добраахвотна павялічылі норму выпрацоўкі, і ўзялі на сябе абавязацельствы. Брыгада зольшчыкаў добраахвотна зьнізіла расцэнкі і павялічыла норму на **27 проц.**, брыгада рэзкі і раскладкі жэлятыннага цэху, у часе перазаключэньня калдагавору павялічыла прадукцыйнасьць працы на **26 проц.**, брыгада па пушэньні і сьпілцы павялічыла норму на **50 проц.** і па апайцы на 15 проц. У такіх-жа процантах гэтыя брыгады абавязаліся зьнізіць расцэнкі, і выклікалі намазчыкаў на сацспаборніцтва. Пілізоўшчыкі другога хромавага цэху павялічылі норму выпрацоўкі на 50 проц., разьбіўшчыкі павысілі прадукцыйнасьць працы на 11 проц., намазчыкі — на 24 проц., футамершчыкі другога хромавага цэху — на 21 проц., прэсоўшчыкі — на 7,5 проц., і райкоўшчыкі на 12,5 проц.

Пры праверцы перазаключэньня дагавораў на заводзе было арганізавана 35 рабочых брыгад з лепшых ударнікаў, у якіх прымала ўдзел звыш 126 рабочых. За час праверкі ад рабочых паступіла 67 прапаноў па паляпшэньні работы заўкому, павышэньні прадукцыйнасьці працы, па паляпшэньні якасьці прадукцыі, рацыяналізацыі і мэханізацыі ўсіх працэсаў вытворчасьці.

На нарадах прафактыву і старэйшых брыгадзіраў, на брыгадных і цэхавых сходах разгарнулася абмеркаваньне пытаньня аб пераглядзе норм. **Раўняцца па перадавых ударніках— вось прынцып ходу перагляду норм.**

Вынікі хронамэтражу абмяркоўваліся на апошніх сходах рабочых. Вось прыклады: старая норма рабочага на ручной пляніроўцы — раўнялася 148 скур у зьмену, а пасьля абмеркаваньня павялічана да 174 скур. Апрача таго, змазка скур, якая раней праводзілася за асобную плату, не ўвайшла ў норму. Пераглядженыя працэсы работ на заводзе ўжо працуюць па новай норме.

Ёсьць ужо прыкладныя вынікі гэтай работы. Плаціроўшчык **Герасімовіч** 16 сакавіка даў за зьмену 190 скур, плаціроўшчык **Страшынскі** — 185.

За час калдагаворнай кампаніі чырвонасьцяжны калектыў ударнікаў скурзаводу «Бальшавік» датэрмінова, 29 сакавіка выканаў прамфінплян першага кварталу першага году другой пяцігодкі ў колькасным выразе на 100,07 проц., і ў цэнкасным—100,27 проц. Рабочыя-ўдарнікі абавязаліся і ў другім квартале яшчэ больш узмацніць барацьбу за прамфінплян, асабліва па якасных паказальніках.

Перагляд норм ня даў павышэньня прадукцыйнасьці працы па заводу на 8,8 проц. Першы хромавы цэх дае павялічэньне на 2,45 проц. і другі хромавы цэх на 6,35 проц., што дасьць эканомію 34.716 руб. Заводзкі камітэт выдае рабочым інструкцыйныя карткі па асвоеньні норм новага калдагавору 1933 году.

Пры абмеркаваньні калдагавору, выпрацавалі плян мерапрыемстваў па павышэньні прадукцыйнасьці працы. Намечана мэханізаваць працэс машыны «Намозі», што дасьць эфэктыўнасьць эканоміі — два чалавекадні і значна палегчыць працу рабочых. Па ініцыятыве рабочых уведзен новы спосаб наклейкі скур па памеру, што дасьць эканомію ў другім квартале 4.5 чалавекадзён, у трэцім квартале 18 чалавекадзён і ў чацьвертым 38 чалавекадзён.

У новым калдагаворы намечана значная мэханізацыя і рацыяналізацыя вытворчасьці. Ужо на сёнешні дзень некаторыя працэсы мэханізаваны, што дасьць прырост прадукцыйнасьці працы на 5 проц. Мэханізаван кутаж, які дасьць павышэньне прадукцыйнасьці працы ня менш, як 10 проц. і значна палепшыць якасьць прадукцыі.

Вялікую масавую работу праводзяць цэхавыя штодзёнкі, якія сыстэматычна асьвятляюць калдагаворную кампанію. Выпушчана звыш 145 газэт за гэты час.

Паасобныя ўдарнікі праявілі сябе, як сапраўдныя героі, напрыклад, тав. **Пугін, Нарочын і Гурэвіч.** Яны дабраахвотна высунулі сустрэчныя нормы, але ня ўсе цэхкомы падхапілі гэту ініцыятыву.

На гэтыя недахопы патрэбна хутка зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу, каб з посьпехам выканаць новую норму 1933 году.

Х.

Пра ход закупкі збожжа

Пастанова бюро ЦК КП(б)Б

Адзначыць, што работа па закупцы збожжа праходзіць вельмі дрэнна і стаіць пад пагрозай зрыву пляну. На 25 сакавіка закуплена ўсяго 2.088 тон, што складае 6,32 проц. пляну. Такое становішча зьяўляецца простым вынікам палітычнага неўразуменьня большасьцю РК і РВК, Белкаапсаюзам і Заўкізбожжам ролі сур'ёзнасьці і важнасьці гэтай гаспадарча-палітычнай работы, поўнай іх бязьдзейнасьці і адсутнасьці кіраўніцтва работай закупачных арганізацый.

Лічачы такое становішча зусім недапушчальным, бюро ЦК КП(б)Б **пастанаўляе:**

1. За бязьдзейнасьць у справе правядзеньня закупкі збожжа:

а) Сакратару Асьвейскага РК — **т. Сьцепановічу** абвясьціць суровую вымову і выклікаць для дакладу ў ЦК. Старшыні РВК **т. Шкадарэвічу** і старшыні райспажыўсаюзу **т. Казанцэву,** улічваючы нядбайную іх працу ў раёне, абвясьціць вымову і папярэдзіць, што калі ў бліжэйшыя дні ня будзе зроблен пералом у справе закупкі збожжа, будуць прыняты больш суровыя меры партспагнаньня.

б) Сакратарам РК Быхаўскага — **т. Канавалаву,** Бярэзінскага—**т. Турыку** і старшыням гэтых РВК **т. т. Грынкевічу, Воўк**—абвясьціць вымову.

в) Папярэдзіць усіх астатніх сакратароў РК, старшыень РВК і старшыень райспажыўсаюзаў, што за выкананьне пляну закупкі збожжа яны нясуць адказнасьць у такой-жа ступені, як і за выкананьне пляну цэнтралізаваных загатовак збожжа, і бюро ЦК будзе прымяняць самыя жорсткія меры партспагнаньня да тых работнікаў, якія не забясьпечаць выкананьня пляну закупкі збожжа.

2. Прапанаваць РК і РВК мабілізаваць на справу выкананьня пляну закупкі збожжа партыйны і савецкі актыў, шастаўўшы канкрэтныя задачы перад кожным сельскім саветам і сель партячэйкай.

Паказаць усім РК і РВК на пецярпімасьць такога становішча, што большасьць сельсаветаў і сельпартячэек стаіць у баку ад закупкі збожжа. РК і РВК папярэдзіць усе сельсаветы і сельпартячэйкі, што яны нясуць адказнасьць за забесьпячэньне поўнага выкананьня пляну сельспажыўтаварыстваў іх сельсавету.

3. Прапанаваць РК і РВК правяраць як праводзіцца 2-х фунтовае адлічэньне і забясьпечыць перагачу гэтага адлічэньня ў поўнае распараджэньне сельспажыўтаварыства.

Прапанаваць РК узмацніць кіраўніцтва па барацьбе са спэкуляцыяй збожжам, не дапускаючы, адпак, перагібаў у адносінах да закупкі збожжа на базарах, якую вытварае працоўнае насельніцтва для сваіх асабістых патрэб.

4. Адзначыць, што ня гледзячы на рашэньні ЦК Белкаапсаюз і Заўкізбожжа кепска кіруюць справай закупкі збожжа, і не пераключыў сваю ніводную на гэту працу. Папярэдзіць т. т. Царовіка і Журомскага, што калі з іх боку ня будуць прыняты адпаведныя меры, ЦК у адносінах да кіраўніцтва гэтых арганізацый прыме больш суровыя меры.

Лічачы недапушчальным асацыяльнае значнай часткі закупленага збожжа ў глыбінных пунктах, прапанаваць БВС, РК і РВК і старшыням райспажыў выезьдці ў трохдзённы тэрмін на прыстаньшчыньскі склады Загатзбожжа ўсю наяўнасьць закупленага збожжа з глыбінных пунктаў, і ў далейшым забясьпечыць вывазку праз кожныя 2 дні.

Просіць ЦБК даць дырэктыву РКК аб вытварэньні пэрыядычнай праверкі наяўнасьці і руху збожжа ў сельспажыўтаварыстве, і справаздачнасьці па закупцы збожжа.

5. Падтрымаць пастанову СНК БССР аб тым, што снабжэньне збожжам раёнаў і гарадоў па цэнтралізаваных і мясцовых кантынгэнтах ставіцца ў залежнасьць ад ходу закупкі збожжа і выканьненьня гарнцавага збору. Разам з гэтым папярэдзіць РК і РВК аб іх адказнасьці за снабжэньне збожжам узятых на снабжэньне кантынгэнтаў па ўстаноўленых для іх нормах.

6. У сувязі з ліквідацыяй раённых кантор Загатзбожжа ўскласьці выкананьне ўсяго пляну закупкі збожжа на сыстэму спажывецкай кааперацыі.

7. Адзначаючы слабую работу друку як цэнтральнага, так і раённых газэт, прапанаваць культпропу ЦК забясьпечыць больш актыўную работу ўсяго друку па выкананьні пляну закупкі збожжа.

Заўком заводу „Камунар" паслабіў работу па калдагаворнай

На заводзе «Камунар» з 22 лютага распачалася кампанія па праверцы перазаключэньня калдагавору.

Было арганізавана 27 самаправерач ных брыгад з лепшых ударнікаў і актыўных рабочых. Агульны ўдзел — 215 чалавек.

Да перагляду дагавору было намечана пераглядзець перавышаных і зьніжаных 1.143 нормы. На сёнешні дзень перагледжаны з зьніжаных норм 763 і перавышаных—53. Такім чынам да гэтага часу засталіся не перагледжанымі 327 проц. Гэта тлумачыцца тым, што заводзкі камітэт за апошні час зусім паслабіў масавую работу па перагляду норм.

Пры праверцы старога калдагавору 1932 г. рабочымі брыгадамі выяўлена некалькі пунктаў невыкананых.

Пераглядженыя 816 норм, якія дадуць эканомію ў 10.873 руб. па цэхах зацьверджаны. Эфэктыўнасьць іх дасьць павышэньне прадукцыйнасьці працы на 21,5 проц., зьніжэньне сабекошту 7,4 проц. і павышэньне зарплаты на 7,8 проц.

Рабочыя брыгады за час праверкі ўнесьлі 68 прапаноў, з іх 55 бытавога характару і 13 вытворчага.

Брыгада **Арнана** высунула сустрэчныя нормы. Замест штампоўкі аржа 143 штук—2.000 штук. Гэта норма зацьверджана і цэхам працуюць па новай норме.

Брыгада **Рыба** бляшанага цэху дабраахвотна зьнізіла сабекошт на 11 проц. Брыгада заліўшчыкаў да абмеркаваньня калдагавору мела на пляну на брак 1,92 проц., а за час калдагаворнай кампаніі зьнізіла брак да 0,3 проц.

За час перазаключэньня калдагавору рабочыя дабіліся зьнішчэньня прагулаў. Працэсыдзьніна значна ўзмацнілася.

Рабочыя заводу за час калдагаворнай кампаніі па-бальшавіцку ўзяліся за ліквідацыю прарыву па выраб запасных частак да трактараў. На сёнешні дзень плян выканан на 100 проц.

Дзякуючы разгорнутаму сацспаборніцтву і ўдарніцтву сярод рабочых-камунараўцаў прамфінплян першага кварталу перавыкананы.

За студзень—141 проц., люты—125,1 проц. і за сакавік—122,1 проц.

Трэба сказаць, што за час калдагаворнай кампаніі шматтыражка «**Камунаравец**» правяла поўную бязьдзейнасьць. За ўвесь час было зьмешчана толькі 2 артыкулы аб значэньні калдагавору і плян правядзеньня. Таварыш **Шэфрына,** рэдактар шматтыражкі, якая зьяўляецца адказным за асьвятленьне ў друку работы па перазаключэньні калдагавору правяла бязьдзейнасьць, яна нават ня ведае становішча работы па заводу па перазаключэньні калдагавору.

Заводзкі камітэт за апошні час зусім паслабіў масавую работу па перагляду норм. Рабочыя прапановы, якія ўнесены за час меркаваньня калдагавору своячасова не разглядаюцца, а ёсьць шмат вельмі каштоўных прапаноў. Такую слабую работу характарызуе і тое, што заўком не дабіўся на сёнешні дзень паступленьня яскравых прапаноў па паляпшэньні работы заўкому. Работа сярод рабочых па ўзяцьці канкрэтных самаабавязацельстваў у часе кампаніі зусім слаба праводзіцца. Вынікі, якія ёсьць, ня могуць задаволіць патрабаваньні партыі і ўраду.

Заўком і ўвесь заводзкі прафактыў павінен гэтыя недахопы ў далейшай сваёй рабоце ўлічыць і апошні больш узмацніць масавую работу сярод рабочых па своячасовым пераглядзе норм. Па-бальшавіцку выканаць норму, зацьверджаную ў калдагаворы 1933 году.

Толькі актыўны ўдзел рабочых у прапрацоўцы калдагавору, толькі канкрэтныя самаабавязацельствы рабочых у часе калдагаворнай кампаніі могуць служыць сродкам ўздыму новай хвалі сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, далейшага павялічэньня прадукцыйнасьці працы і паляпшэньня якасьці прадукцыі. На гэта ёсьць усе магчымасьці ў рабочых - камунараўцаў.

Д-х.

Я. ІВАШЫН

ПАВУЧАЛЬНЫ ЎРОК ЛЁЗЬНЯНСКАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ

Лёзьнянскі раён уступае ў праяўленьне першай бальшавіцкай вясны другой пяцігодкі пры залучэньні 205 калгасаў, якімі зараз, з новым прыплывам яднаецца каля 70 проц. беднякоў-серадняцкіх гаспадарак. Такім чынам, Лёзьнянічына ідзе ў ліку перадавых раёнаў БССР па завяршэньні сацыяльнай калектывізацыі.

Прымаючы пад увагу, што сталыпінская палітыка ахутрываці пры самаўладзьце і правадзімая ў свой час тая-ж стаўка на кулака ідэолягам беларускай контр-рэвалюцыйнай нацдэмаўшчыны Прышчэпавым у гэтым раёне знайшлі ясабліва яркае ўвасабленьне, з усёй відавочнасьцю прадстаўляюцца тыя складаныя ўмовы і труднасьці, якія сустракаліся і сустракаюцца на шляху калгаснага будаўніцтва.

Пачаўная кутарская сыстэма ў раёне і даволі высокі процант кулацка-заможных гаспадарак, шалёнае супраціўленьне кулацкіх элемэнтаў у самых розных формах—пакладаюць на партыйную арганізацыю абавязак высокай рэвалюцыйнай пільнасьці, выразнасьці і клясавага ідэйнага ў рабоце, якая забясьпечвала-б сапраўдныя посьпехі барацьбы за бальшавіцкія калгасы, за іх арганізацыйна-гаспадарчае і палітычнае ўмацаваньне, бязьлітасна перамагаючы супраціўленьне рэштак недабітага кулацтва і яго агентуры.

Трэба адзначыць, што дасягнутыя ў раёне посьпехі ў справе арганізацыі і росту калгасаў ўнесьлі шэраг элементы благадушнасьці і самазадаволенасьці ў Лёзьнянскую партарганізацыю. Раённае партбюро ўмацаньня не ўсьведоміла таго, што посьпехі калгаснага будаўніцтва не зьмяншаюць, а павялічваюць клопаты і абавязаньні партыйнай арганізацыі ў справе кіраўніцтва сельскай гаспадаркай. Таму кіраўніцтва калгаснай гаспадаркі ў Лёзьнянскім раёне ажыцьцяўляецца вельмі слаба, а ў радзе месц зусім адсутнічае. Аб гэтым сведчаць факты вялікай засьмечанасьці многіх калгасаў, кулацкімі элемэнтамі.

Надаўна выкрытая «Зьвяздой» правапартыўністычная тэорыя старшыні РВК **Бамакава** аб «нэйтральных» кулаках, яго разважаньні аб «нематэрыяльнасьці» ачышчаць калгасы ад кулацкіх элемэнтаў, каб ня зьнізіць процанту калектывізацыі, у цэлым радзе калгасаў зьяўляліся практыкай. Ня дзіва, што ва многіх вылядках кулацкім і іншым антысавецкім элемэнтам удалося пралезьці ня толькі на важнейшыя вучасткі калгаснай вытворчасьці, а нават і ў партыю, з шэраўнай варожай мэтай.

Вось некалькі найбольш яркіх прыкладаў, якія характарызуюць манэўры клясавага ворага і яго новую тактыку ў барацьбе супроць калгаснага будаўніцтва. Калгасам «**Авангард**», Кабылінскага сельсавету, верхаводзіў выпадкова трапіўшы ў партыю нейкі **Іванаў,** чалавек з даволі цёмным мінулым. Гэны вораг з партыйным білетам у кішэні радасна прымаў у калгас кулакоў і прасоўваў іх на важнейшыя вучасткі калгаснай вытворчасьці. Работа гэтай кулацкай шэры дала свае вынікі. Асноўную кульцуру ў гэтым калгасе лён — сеялі на высокіх горах, добра ведаючы, што лён прападзе, а яны затое атрымаюць ад дзяржавы страхоўку і пазбавяцца ад выкананьня пляну ільназагатовак. У гэтым-жа калгасе за год выміцана 37 шт. буйной рагатай жывёлы для нладжаньня розных банкетаў. З прычыны шкодніцкай работы на сьвінарніку, адыход дзіцку былога буйшога арандатара **Карташэвіч,** сына кулака Пятрушэнка, які ў свой час арандаваў больш чым 100 гэкт. зямлі і інш.

У калгасе «**Чырвоны шлях**», Горбасьскага сельсавету, пырока разьвіта шкодніцтва на зьнічтожэньні конскага паголоўя, у выніку чаго шмат коней выведзена са строю. Група кулацкіх элемэнтаў у калгасе «Інтэрнацыянал», гэтага-ж сельсавету, арганізавала палбухтарства на выгад з калгасу бедняко ў, ціскала іх заявы з указаньнем сваіх кулацкіх матэрыялаў. Зараз выяўлена, што ў гэтай групе прымала ўдзел 17 чалавек яўных кулакоў і іншых антысавецкіх элемэнтаў. Там аказаліся і кулакі, якія зьцяклі з высылкі. Гэта контр-рэвалюцыйная шайка пазьдзелася ў калгасе пад апекай кулака **Смольскага,** які зьяўляўся старшынёй калгасу і нават членам партыі.

Буржуазны перараджэнец **Прудзнікаў,** будучы старшынёй калгасу ў Асінаўскім сельсавеце, дакзам з кандыдатам партыі **Бабровым** утойвалі сапраўдную ўраджайнасьць і прыбыткі калгасу в той мэтай, каб ухіліцца ад выкананьня абавязкаў перад дзяржавай па загатоўках. Сын гэтага **Баброва** за параўнальна невялікі час сваёй «работы» ў якасьці рахункавода растраціў звыш 1.000 рублёў.

Падобныя злачынствы клясава-варожых элемэнтаў праводзіліся беспакарана, у радзе выпадкаў пры простым натуральні камуністаў, якія страцілі клясавую пільнасьць, аказаліся буржуазнымі перараджэнцамі—простай агентурай кулака. Калі высуналася было пытаньне самімі калгаснікамі аб чыстцы калгасу «**Баявік**» (Старабабыльскі сельсавет), дык з трох партыйцаў гэтага калгасу толькі адзін падтрымаў прапанову калгаснікаў. «Камуністкам» Жырчанская пашчыла для сябе найбольш выгадным застацца «нэйтральнай» у гэтым пытаньні, а **Арманові** актыўна выступіў у абарону кулакоў, даказваючы, што «хоць кулакі і ёсьць у калгасе, але яны працуюць добрасумленна». Прычыны такіх выступленьняў будуць зусім ясныя, калі сказаць, што ячэйку Старабабыльскага сельсавету узначальваў да апошняга часу былы дзяк **Дзянісенка,** які лічыў сваім клясавым абавязкам працягнуць у склад ячэйкі яўна кулацкія элемэнты, як напрыклад, дачку былога буйшога арандатара **Карташэвіч,** сына кулака **Пятрушэнка,** які ў свой час арандаваў больш чым 100 гэкт. зямлі і інш.

У сакавіку Крынкаўская парт'ячэйка лічылася камуністамі два браты **Катовічы,** якія на працягу цэлага году займаліся арганізацыйным раскраданьнем калгаснай маемасьці. Кіраўніцтва ячэйкі на чале з сакратаром **Марцыновічам** па сваёй палітычнай сляпаце не зацікавіла гэтага і не рэагавала, пакуль гэты злачынствы ня былі выкрытыя сьледчымі органамі.

Не зважаючы ў сваіх радах яўных клясава-варожых элемэнтаў і іншыя парт'ячэйкі. Сын кулака **Буевіч** утаіў сваё сацыяльнае паходжаньне, пралез у партыю і на кіруючую работу ў райсавет Асоавіяхіму. Кулак **Мілюкоў** ня толькі ўмудрыўся пралезьці старшынёй калгасу «**На страх ворагу**», а нават прыняваўся і да партыі. У лёзьнянскай партарганізацыі аказаўся і ведомы ў раёне бандыт **Ярмолаў,** і рад іншых антысавецкіх элемэнтаў.

Пасьля ўсіх гэтых фактаў паўстае пытаньне, дзе прычыны такой засьмечанасьці лёзьнянскай партыйнай арганізацыі?

Асноўная прычына заключаецца ў тым, што былое раённае парткіраўніцтва груба скажала дырэктывы партыі аб рэгуляваньні сацыяльнага складу пры прыёме ў партыю. Райком КП(б)В арыентаваў парт'ячэйкі толькі на колькасны рост, не зазнаёмляючы ўвагі на задачах якаснага адбору і праверкі на практычнай рабоце тых, каго прымаюць у партыю. Таму ў практыцы многіх ячэек атрымалася так, што прымалі ўсіх тых, хто самацёкам падаваў заявы. Райком партыі не рэгуляваў росту, а штампаваў **неправерэныя** анкеты. Апытаньне людзей на пасяджэньні бюро РК КП(б)Б пры прыёме іх у партыю насіла фармальны, безадказны характар. Апытаньне тых, каго прымалі ў партыю, зводзілася толькі да таго, ці ёсьць абразы ў сяле і ці п'е ён гарэлку. Пры адмоўных адказах на гэтыя пытаньні, былы сакратар РК **Вайновіч,** нібы жартуючы дадаткова запытаў: «А з жонкай ты параўся?»

І так, у практыцы Лёзьнянскага РК КП(б)Б асноўным крытэрыем для вызначэньня вартасьці прыёму ў партыю зьяўлялася не сацыяльнае становішча, не высьвятленьне ступені ўсьведамленьня статуту і праграмы партыі, не праверка ідэалёгічнай устойлівасьці і актыўнасьці на практычнай рабоце, а досыць было напісаць у анкеце «калгаснік» і заявіць, што абразы з хаты выкінуў і гарэлку ня п'е і справа вырашалася станоўча. У пратаколе пасяджэньня бюро РК мэханічна запісвалася: «прымаць».

У практыцы прыёму ў партыю райкому даводзілася часта сустракацца з фактамі адсутнасьці падробнай колькасьці рэкамэндацый, але гэта ў Лёзьнянічыні «дробязьзю». Члены бюро РК тут-жа давалі свае рэкамэндацыі і такім чынам справа з фармальнага боку прыводзілася ў парадак. Даючы рэкамэндацыю для прыёму ў партыю, кіруючыя работнікі РК у большасьці выпадкаў

ЛІСТОК ЦКК-НК РСІ

РАШУЧА УДАРЫЦЬ ПА ТЫХ, ХТО ІГНАРУЕ ПАСТАНОВЫ ПАРТЫІ І УРАДУ АБ ПАДРЫХТОУЦЫ КАНЯ ДА СЯУБЫ

Выкарчаваць шкодніцкія адносіны да каня

(З лістоў калгасьнікаў Ельскага, Тураўскага і Барысаўскага раёнаў)

Савет Народных Камісараў СССР і Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) у сваёй пастанове ад 10 лютага 1933 году аб падрыхтоўцы рабочай жывёлы да веснавой сяўбы ясна ўказаў, што: «Не пазьней 20-га лютага правесьці, пад асобістай адказнасьцю старшыні калгасу і дырэктара саўгасу, дакладны агляд усяго конскага складу за ўсіх калгасах і саўгасах і разьбіць яго на дзьве групы—працаздольных і скабасільных. Усіх слабасільных коней неадкладна вывалюць ад якіх-бы тамі ні было работ і паставіць іх на ўзмоцнены падкорм з тым, каб да пачатку веснавой сяўбы поўнасьцю адновіць іх працаздольнасьць».

І далей:

«Усіх жарабных матак абавязкова выкарыстаць ад цяжкай работы за два месяцы да жарабеньня, і дапускаць да работы не раней чым праз месяц пасьля жарабеньня. Адказнасьць за правядзеньне гэтага мерапрыемства на кожнай брыгадзе нясе брыгадзір, а на калгасе ў цэлым—старшыня калгасу».

З прыведзенага зусім ясна, якая павінна быць увага да каня, але ў некаторых месцах партыйныя і савецкія арганізацыі не жадаюць гэтага зразумець. Тыя факты, якія цытуюцца ў сёньняшніх матар'ялах, са ўсёй яркасьцю сьведчаць аб ігнараваньні важнейшых пастаноў партыі і ўраду аб захаваньні цягавай сілы да веснавой сяўбы. Вось яны:

У калгасе «Бальшавік», Скародзінскага сельсавету, Ельскага раёну з 75 рабочых коней толькі 10 прыгодны да палявых работ. Большая частка коней слабасільная, а чатыры коні зусім не ўстаюць. Гэта адбылася ў выніку таго, што калгас засьмечан варожымі элементамі. «Калгасьнік» кнігай брыгады, **Патапенка Алесь**, замест таго, каб вазіць угнаеньне са станцыі, развозіў пасажыраў, запнаў двух коней і ад перагону яны загінулі. Праўленьне калгасу аб гэтым ведала, але мер не прымала. Другі «калгасьнік», **Пятровіч Базыль**, пачаў вазіць дровы і па дарозе пачаў біць валоў так, што здзін з іх пазваліўся і выбіў сабе рогі. Трэці «калгасьнік», **Патапенка Мікола**, паклаў на сала столькі дроў, што ён ад натугі здох. Патапенка Янка пахаў у лес і пачаў рубіць бярозу, якая ўпала на вала.

Да ўсяго гэтага трэба дадаць, што у выніку неўгбайна-шкодніцкіх адносін праўленьня да калгаснай гаспадаркі, у мінулым годзе сьпісілі 25 га сенажаці і не ўбралі яе, а зараз кармяць коней ацвяк чым. Жывёлу даглядаюць клясава-варожыя элементы—**Пархоменка Якаў і Гоўрмель Карп.**

***

Калгас «Чырвоны пуцілавец» амаль сёмы буйны ў Тураўскім раёне. Адных толькі коней у калгасе 220 штук, з іх рабочых—152, матак 42 і жарабчыка 26 штук. Здавалася-б, што праўленьне калгасу і ў першую чаргу старшыня **АРЦЮХОВІЧ** павінны былі сьвярнуць асаблівую ўвагу на поглед коней, але па справе выглядаецца зусім інакш. У калгасе да гэтага часу не праведзен агляд конскага пагалоўя. Размёўка коней на працаздольных, слабых і непрацаздольных таксама не праведзена. Вадапой і кармленьне робіцца несваячасова, чыстка коней адсутнічае, яны худыя і слабыя.

Кідаецца ў вочы такі факт, што з 17 чалавек конюхаў толькі адзін бедняк. Таму, не выпадкова, што ёсьць варожыя настрої. Напрыклад, такія «разважаньні»: «коней чысьціць ня трэба, дай ім аўса, яны і так будуць чыстымі», «...мы нічога на зробім і ня можам зрабіць, каб коні былі сытыя і напраўдзішнія». І ня дзіва, што ў мінулым годзе на стайні забівалі жарабят для таго, каб прадаць скуру, на дзіва, што ў мінулую вясну падохла 10 лепшых калгасных коней.

Ці пя сьведчаць гэтыя факты аб апартуністычнай сьлепаце старшыні калгасу **Арцюховіча** і старшыні сельсавету **Слоцкага**? Ці ня ёсьць тут простае ігнараваньне важнейшых пастаноў партыі і ўраду?

***

У калгасе імя Домбаля, Лосінскага сельсавету, Барысаўскага раёну за адзін толькі год загінула 11 коней. Калі запыталі былога старшыню калгасу **Савінскага**, чаму яны загінулі, дык ён адказаў:

—Цяжка сказаць, не памятаю калькуляцыя, але ў актах запісана, можна даведацца.

А што-ж у актах запісана? У актах запісана, што «коні загінулі ад заморанасьці».

Што ў актах не запісана? Не запісаны ў акты тыя шкодніцкі, выпадковыя «калгасьнікі», якім праўленьне калгасу даручыла даглядаць коней. Вось яны: **Мурашка, Макоўскі, Малеўскі, Пшыгоцкі, Савінскі** і іншыя. Ці можна абынак глядзець на такія «гадаваньні», што ў калгасе з 132 коней—56 непрацаздольных, калі дзесятку коней здольных хадзіць толькі калі дваро і толькі 60 з іх можна лічыць працаздольнымі.

Да такога становішча конскае гаспадарка ўвялі шкодніцкі і клясава-варожыя кулацкія элементы, пралезлыя ў калгас. На хутары Мурашках кулакі **Гараўскі і Пшыгоцкі** пад прыкрыцьцём брыгадзіра **Макоўскага**, былога добраахвотніка беларускай арміі, што хочуць, тое і робяць. На працягу двух год на гэтым хутары загінула 12 коней. Гэта ў той час, як на хутары засноваў сваю «розыдэнцыю» ветэрынарны фельчар **Раманаў**. Кожны раз, як толькі здохне конь, Раманаў пацісвае акт, што «конь загінуў ад заморанасьці». І ня толькі коні. Па Раманавай характарыстыцы і кароўы, і сьвінні, і нават куры гінуць «ад заморанасьці».

У студзені быў такі выпадак. Раманаў узяў двух коней для лячэньня і ў выніку коні праз тыдзень загінулі. У актах Раманаў прапампаваў, што «коні загінулі ад заморанасьці».

Трэба адзначыць, што райінспектар па ветнагляду **Азерскі** ўсё гэта ведаў, але мер ніякіх ня прымаў. Ведаў Азерскі і аб тым, што на СТФ калгасу пра пала амаль палова сьвіней, але таксама мер рэагаваньня ня было. Чаму? Ды таму, што **Азерскі і Раманаў** часта разам п'янствуюць, а таму і мер ня прымаў.

Праўда, меры сякія-такія прымаюць і без Азерскага. Частка шкодніцкай аддана пад суд, аддан пад суд і былы старшыня калгасу **Савінскі**. Але пас цікавіць, чаму да гэтага часу, на прыкладзе **Рудзкі** ня адказнасьці ветфельчар Раманаў? Чаму да гэтага часу не прыцягнут да адказнасьці былы белабандыт Макоўскі, які загубіў 12 самых лепшых калгасных коней?

Партыйная ячэйка калгасу страціла клясавую пільнасьць. Сакратар партячэйкі **Невяроўскі** прыкрывае шкодніка Макоўскага таму, што ён яго сваяк. Райпрокурор **Коцін** і начальнік міліцыі **Румянцаў** праявілі тыпы лібералізм да шкодніка з калгасу імя Домбаля. Яны ціпер да гэтага часу ня выканалі пастановы райвасеўкому аб дакладзе ў трохдзённы тэрмін усёй гэтай справы.

***

Зусім іншы малюнак мы маем у Дрысенскім раёне. Там з абвяшчаньня дакладнага праверкі пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб падрыхтоўцы конскага пагалоўя да веснавой сяўбы быў выгучаны брыгады і накіраваны па сельсаветах. У саўгасе Бігосаго, напрыклад, маламоцныя коні пастаўлены на ўзмоцнены падкорм. Створаны кармавыя фонды на час веснавой, вылучаны лепшыя рабочыя конюхамі—**Цынгель, Лукашэнка, Кузьміч і Калясоўскі**, якія штодзённа чысьцяць коней, расчышчаюць іх капыты і г. д. Такое-ж становішча назіраецца і ў калгасах «Штандар», «Чырвоны ўдарнік», Лунячарскага сельсавету і ў радзе іншых калгасаў раёну.

Праўда, у паасобных калгасах брыгады выявіў, што праўленьні калгасаў несваячасова ўзяліся за правядзеньне ў жыцьцё дырэктыў партыі і ўраду. Напрыклад, калгасы «Пагранзорка», «Ільліч», Лунячарскага сельсавету, «Земляроб», Сардыцкага сельсавету і інш. Старшыня калгасу «Пагранзорка» **Сьвіловіч** і брыгадзір **Кабылінскі** разбазарылі кармы, прадалі сена і не забясьпечылі конскае пагалоўе фуражом.

***

Паказаныя факты выразна сьведчаць пра тое, што ў паасобных калгасах Ельскага, Тураўскага і Барысаўскага раёнаў пастанова ЦК УсеКП(б) і СНК СССР ігнаруецца. Партыйныя ячэйкі зусім выпусьцілі з-пад увагі тое, што **«новая тактыка клясавага ворага зводзіцца ў аскоўным да таго, каб з сярэдзіны падточваць, дзяргані заваць грамадзкую сацыялістычную гаспадарку»**.

Каб шкодзіць і быць непрыкметнымі, клясавыя ворагі выкарыстоўваюць усе сродкі. Яны часамі прыкрываюцца годнасьцю калгасьніка, або «сумленнага» служачага калгасу і нават пралазяць у партыю і камсамол і, пад прыкрыцьцём партыйнага і камсамольскага білету, праводзяць сваю шкодніцкую работу.

Рэдакцыя газ. **«Зьвязда»** і ЦКК-РСІ чакаюць ад мясцовых арганізацый самога хуткага рэагаваньня на паданыя факты.

АЗДАРАВІЦЬ КАЛГАС „ЧЫРВОНЫ ТРАКТАР"

Тав. Сталін сказаў, што кулакоў трэба пускаць у самым калгасе на кіруючых пасадах, яны пралезьлі туды, каб падарваць эканамічную моц калгасаў з середзіны. Гэтых указаньняў правадыра ня ўлічыла **Скарокзінская** парт. ячэйка, Ельскага раёну. У яе на вачох кулацкая зграя праводзіць у калгасе «Чырвоны трактар» сваю шкодніцкую дзейнасьць. Я, працуючы ўпаўнаважаным ЦКК НК-РСІ, выявіў рад фактаў.

Калгас «Чырвоны трактар» арганізаваўся ў 1929 г. З пачатку, пакуль на чале яго стаялі сапраўдныя бальшавікі, усё ішло добра. У 1931 годзе ў кіраўніцтва калгасу пралез кулак **Руцкі**. У мінулым ён эксплёатаваў наёмную рабочую сілу, і індывідуальна абкладаньня ўнікнуў толькі дзякуючы сяброўству з былым старшынёй с.-с.

Ён акружыў сябе зграяй сабе падобных людзей (**Патапенка, Серы і Дабрынец**) і разам з імі распачаў ювую злачынную работу. Пачаў з таго, што загадаў сёньня жыта там, дзе яно не магло вырасьці. Калгасьнікі супраціўляліся, але Руцкі з гэтым ня лічыцца, і ўраджай атрымаўся вельмі нізкі. Тое-ж самае было і з іншымі культурамі.

У часе разьмеркаваньня ўраджаю ацрамя насеннага і страхавога фондаў Руцкі выдзеліў яшчэ фонд на час веснавой пасеўкампаніі. Зараз з гэтага фонду выпадае тым, хто не працаваў у мінулым годзе. У мінулым годзе Руцкі 200 га дабраякаснай сенажаці аддаў лесарабкаапу, а калгас застаўся бяз сена. Восеньню, у выніку дрэннага догляду, загінула 40 штук сьвіней. Праўленьне калгасу ведала пра гэта, але не прымала ніякіх мер.

Да веснавой сяўбы калгас не гатоў.

ДВА БАКІ ШКОДНІЦКАЙ МЭДАЛІ

Вал. Мядзьведзеў

Не кажае 6 цэнтнераў насеньня пахкультур. Рабочая жывёла ў дрэнным становішчы. Нахапаны калгасьнікамі торф ляжыць у балоце, і не скарыстоўваецца. Самаатрытыкі ў калгасе праўленцы ня любяць. Руцкі за сваёй кампаніяй нават не даюць гаварыць калгасьнікам на сходзе.

Жалезьнякоў.

Праўленьне калгасу патурае кулаку

(Ліст калгасьніка)

Калгас «Чырвоны бор», Бялынічскага раёну, арганізаваўся ў 1928 годзе. За час свайго існаваньня калгас стаў эканамічна моцным. Але ў 1932 годзе ў кіраўніцтва калгасу пралезьлі кулакі і іх агенты, і арганізавалі шкодніцкую групу. У склад гэтай групы ўвайшлі наступныя: старшыня калгасу **Цалавальнік** — моцны серадняк, **Кунцэвіч Л.**, былы старшы конюх памешчыка, ён разам са сваім бацькам, старшым упраўляючым маёнткам, выдзекваўся над сялянамі. Брат яго, **Кунцэвіч І.**, таксама зьяўляецца членам праўленьня калгасу, працуе сакратаром і рахункаводам. Да гэтай-жа групы трэба далучыць **уладаўніка калгасу Падольскага**, яго брата, сакратара с.-с., і **Талана**—старшыню гэтага-ж с.-с. Да рэвалюцыі яны мелі буйныя гаспадаркі і эксплёатавалі наёмную рабочую сілу.

Пралезшы ў калгас гэтыя агенты кулака пачалі раскрадваць і разбазаваць калгасную маемасьць. Кароў у калгасе было 80, а засталося толькі 10. Лік сьвіней, у выніку іх злачынай дзейнасьці, таксама значна зменшыўся. Было 170 штук, а засталося —20. Згніло 1.000 пудоў сена і такая-ж колькасьць бульбы, і 800 пудоў саломы. Раскрадзена 200 пудоў жыта і, акрамя гэтага, яшчэ 220 пудоў ня было зусім запрыходавана. Браты Падольскія за калгасны хлеб купілі сабе два гармонікі, якія каштавалі 1.500 руб.

Гэта злачынная дзейнасьць была выкрыта калгасьнікамі, і пралетарскі суд прыцягнуў **Цалавальніка** і братоў **Кунцэвічаў** да строгай адказнасьці. Месца іх у калгасе заняли **Прыбылёў** (новы старшыня калгасу) і сакратар **Баранавіцкі**. Яны, разам з астатнімі членамі шкодніцкай групы, працягваюць злачынную дзейнасьць. Ніякага вучоту ў калгасе няма. Увесь інвэнтар валяцца дзе папала. Панае поўная абязьлічка. Коні калгасу ледзь валочаць ногі і, зразумела, што веснавая работа будзе ім не пад сілу. З агульнага ліку 36 коней, толькі 8 могуць працаваць. Малако ад калгасных кароў не здаецца дзяржаве, а разьмяркоўваецца паміж членамі праўленьня.

Чыстку калгасу шкодніцкая група, пры падтрымцы інструктара МТС **Карэліцкага**, скарыстала для таго, каб адпомсьціць тым, хто аддаў пад суд **Цалавальніка і Кунцэвіча**. Без усякага галасаваньня выключылі з калгасу бедняка, селькора **Кунца, Пажарыцкага, Кісялёва** і рад інш. Ланькаўскі с.-с. замест разгляду гэтай справы па-бальшавіцку, даводзіць пленны загатовак бульбы, ільну і іншых прадуктаў да дваро калгасьнікаў, якія да ўступленьня ў калгас мелі маламоцныя гаспадаркі. Ёсьць факты, калі с.-с. абкладае серадняко-ў-калгасьнікаў індывідуальным падаткам (Кісялёў, Пажарыцкі).

Калгасьнікі абураны такімі дзеяньнямі праўленьня, і патрабуюць суровага пакараньня вінаватых.

Свой.

Конь павінен быць у надзейных руках

У калгасе **«Ударнік»**, Алепаўскага сельсавету (Талачынскі раён) калгасьнікі на чале з праўленьнем сапраўды па-ўдарнаму адносяцца да каня. Тут добра распрацаваны пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб адносінах да каня, кожны калгасьнік усьядомлены важнасьць большавіцкіх задач і па-сацыялістычнаму змагаюцца за здаровае і моцнае конскае паголоўе. Коні ў калгасе «Ударнік» знаходзяцца ў коўнай, чыстай і сьветлай стайні. Кожны конь мае станок і кармушку.

Усё пагалоўе коней замацавана за адпаведнымі брыгадамі і брыгадзірамі. Кулацкая абязьлічка і барбарокія адносіны да каня тут вытручаны. Кожны брыгадзір-калгасьнік нясе асабістую адказнасьць за становішча каня, які за ім замацован і ўсе сумленныя калгасьнікі штодзённа клапоцяцца за стан усёй цягавай сілы. Кармленьне коней і вадапой праводзіцца рэгулярна тры разы ў дзень. Кармы выдаюцца па нормах. У выніку ўсяго гэтага коні «Ударніка» сярэдняй сытасьці і ў поўнай меры падрыхтаваны да балявых работ веснавой сяўбы. На час сяўбы створан спэцыяльны кармавы фонд—лепшай якасьці сена, у ліку 200 пудоў, а таксама патрэбная колькасьць канцэнтраваных кармоў.

Акрамя ўсяго гэтага праўленьне калгасу рэгулярна, кожную дэкаду, праводзіць нарады канюхоў, дзе абмяркоўваюцца пытаньні, як лепш наладзіць догляд за коньмі, як больш рацыянальна скарыстаць кармы і г. д. На нарадах конюхі і перадавыя калгасьнікі і калгасьніцы актыўна прымаюць удзел і падмячаюць заўважаныя недахопы, уносяць канкрэтныя прапановы, як зьлічыць іх.

Прыведзеныя факты гавораць аб тым, што ў калгасе «Ударнік» калгасьнікі ў штодзённым жыцьці змагаюцца з кулаком і іншымі ворагамі калгасу, праводзяць у жыцьцё дырэктывы партыі і ўраду, змагаюцца за калгаснага каня і за моцны бальшавіцкі калгас. Змагаюцца, каб кожны калгасьнік-ударнік стаў сапраўды замоцным калгасьнікам.

Зусім адваротнае мы маем у суседніх двух калгасах—**«МОПР»** і **«Камунар»**. У гэтых калгасах коні знаходзяцца ў дрэнных умовах і зусім не падрыхтаваны да веснавой сяўбы. У гэтым калгасы пралезьлі кулацкія элементы. Абнаглелыя ворагі калгаснага будаўніцтва распаўсюджваюць свае кулацкія «лёзунгі»—«Раз дзяржава дае трактары, дык навошта нам конь». Праўленьне калгасу «МОПР» замест таго, каб даць адпор гэтай нагласьці кулакоў і падкулачнікаў падпала само пад уплыў кулацкіх «лёзунгаў» і зусім не займаецца пытаньнем падрыхтоўкі моцнага каня да сяўбы. У гэтым калгасе ўсё ў пучы: кармушкі і стайкоў для коней няма, коні кідаецца пад ноч, коні ніколі ня чысьцяцца, і рад іншых агідных фактаў.

Такі-ж адмоўны малюнак і ў калгасе «Камунар». Кулацкі падпявала з гэтага калгасу, «самасамолец» **Багаи**, дапамагае варожым элементам, здзекуецца над коньмі і сам без усякага дазволу запрагае калгасныя коні і разьязджае па вечарынках. Багаи гоніць коні, што ёсьць моцы, чым выводзіць лепшых коней са строю. Камсамольская ячэйка глядзіць на гэта скрозь пальцы і па-апартуністычнаму адносіцца да дзейнасьці Багана, які за свае ўчынкі павінен быць не толькі выключан з камсамолу, а аддан пад суд, як разбуральнік калгаснай маемасьці.

Аленаўскі сельсавет і партячэйка павінны безадкладна заняцца справай ачысткі калгасаў ад кулацкіх элементаў, разьбіць ушчэнт кулацкую агітацыю, узмацніць клопаты аб кані. **Як конь, так і трактар павінны быць у надзейных руках калгасьнікаў-ударнікаў, змагароў за баявыя задачы сацыялістычнага будаўніцтва. Пры гэтых умовах першая веснавая сяўба другой пяцігодкі будзе праведзена па-ўдарнаму, па-бальшавіцку.**

ГДАЛЯ ТРАПЕР.

АПОСТАЛЫ КУЛАКА

Вал. Мядзьведзеў

Скарачэньне апарату па Гомелі ня скончана

Першыя дні работы гомельскай РКК РСІ па скарачэньні штатаў паказалі, што ў Гомелі ёсьць каго скарачаць, у некаторых установах сядзелі лішнія людзі.

Возьмем такую ўстанову, як кіраўніцтва Дняпра-Дзьвінскага дзяржаўнага рочнага транспарту, якое падаўна пераехала з Магілеву і па старых працыцях захавала старыя штаты і старых сяброў па рабоце. Сэктароў тут не пераліўшы, а ў сэктарох, вядома, людзі. Фінсэктар складаўся з 18 штатных адзінак. Начальнік сэктару —неабходная адзінка, а далей цэлая шарэнга розных бухгальтароў. У сэктары працаваў галоўбух Марголін, і яго памочнік, і яшчэ два старшых бухгальтары. Акрамя гэтых чатырох «бухаў», працавалі яшчэ проста бухгальтары (адзін бухгальтар, і яшчэ адзін, усяго 8 чалавек). Камісія гарКК РСІ пакінула ў сэктары толькі пры работніці: старшага бухгальтара, нам. бухгальтара і рахункавода.

Ня лепшае становішча было і ў іншых сэктарох. Да скарачэньня ў судна-эксплёатацыйным сэктары было 10 чалавек і таксама ўсе са званьнямі: нач. сэктару, два інжынэры па суднаремонце, тэхнік і г. д. Цяпер у сэктары засталіся толькі тры работнікі. Кожны вядае сваю работу і адказвае за яе. Сэктар эксплёатацыі меў 8 чалавек, пасьля скарачэньня засталося пяць. У кіраўніцтве выяўлена 17 чалавек, якія амаль нічога не рабілі і атрымлівалі ў сярэднім каля 2.000 рублёў у месяц. З 88 чалавек у кіраўніцтве засталося 71. Адначасова з гэтым праверылі штаты воднапрадазу і водПСТ. Па гэтых установах скарацілі 5 чалавек.

У Гомельсьпарпраме да скарачэньня было 45 штатных адзінак, а засталося толькі 11. Скарацілі і такія пасады, як агента асобых даручэньняў, якія нават ня ведаў сваіх абавязкаў, загадчыка тэхнічнай бясьпечнасьці, які толькі сядзеў у мяккім крэсьле, іграў па тэлефону, «турбаваўся аб бясьпечнасьці» і за гэта атрымліваў 275 рублёў у месяц.

Гомельская кантора ЛСПО мела штат у 15 чалавек. Добра было працаваць, асабліва ўпаўнаважаным па садох. Зімой яблыкі не растуць, а ўлетку—камандыроўкі, вольнае паўзетра і г. д. Але гомельская гарКК-РСІ знайшла, што гэтыя людзі на іншай рабоце прынясуць больш карысьці і скарацілі 8 чал.

Ва ўстановах з меншым размахам, як, напрыклад, у гомельскім аддзяленні Белдзяржкіно скарацілі толькі 5 чал. з акладам у 750 руб., а ў гомельскім ЦРК з 40 чал. пакінулі 32. У сэктары грамадзкага харчаваньня ЦРК працавала 24 чал., а пасьля скарачэньня засталося толькі 12. Гэта дае эканоміі каля 3.000 руб. у месяц.

У тутунёвай фірме «Саюзтабак» з 11 шчасьлівых, знайшоўшых тут сабе прытулак, засталося толькі 6.

Можна прывесьці такіх фактаў ішчэ многа, але і з гэтых можна пераканацца, як разбухалі штаты, як мала турбавалася адміністрацыя раду ўстаноў аб палепшэньні работы апарату. Фінансавая дысцыпліна да іх не адносілася. Тыя, што шукалі хлебных месц, разьмясьціліся ў кашцыярых Гомкаапхлеба. Было ў гэтым апараце 10 чалавек, пасьля скарачэньня засталося 6. Былі лішнія людзі і ў Гаржысаюзе, з апарату ў 24 работнікі, засталося толькі 16, дый гэтага ішчэ многа.

Выгадна было працаваць у такой установе, як Гомгарцыль. Стаўкі тут добрыя, дый адказнасьці зусім няма. Таму і было там 25 чалавек. Пасьля скарачэньня засталося 17, але кожна і трэба было скараціць значна больш.

Добра жылося работнікам Гомгарпэфсавету. Мясцовая газэта «Палесская праўда» выкрыла ўсю сыстэму пэфскай работы. Людзі займаліся больш камэрцыяй, чым пэфствам над вёскай. Скарацілі тут 13 асоб, з агульнай сумай зарплаты ў 13.000 руб. у год.

У часе скарачэньня штатаў гарКК ня ўлічыла некаторых момантаў і таму адрымалася блытаніна. Справа ў тым, што некаторыя установы, як, напрыклад, «Союзхлопкосбыт» праводзілі скарачэньне штатаў па сьпісах, зацьверджаных у мінулым годзе, і такім чынам скарачалі людзей, якія ўжо даўно там не працуюць.

Цяпер некалькі слоў аб выніках скарачэньня штатаў у Гомелі. У 71 установе гораду зволена 105 чалавек. Канчатковы вынік яшчэ не падведзен, але па прыблізных падліках можна сказаць, што гэта дасьць дзесяткі тысяч рублёў эканоміі.

Але РКК-РСІ не даволі добра арганізавала гэту справу. З тых людзей, якія былі скарочаны, толькі 4 пасланы на раён, а рэшта зноў знайшла сабе цёплыя месцы ва ўстановах гораду. 22 чалавекі, звольненыя з апаратаў сампрамкаапэрацыі, на другі-ж дзень пасьля скарачэньня зноў пачалі працаваць у сыстэме прамкаапэрацыі, у розных арцелях, майстэрнях, аддзяленьнях. Людзі, скарочаныя з аддзяленьня Белсельбуду, таксама хутка знайшлі сабе работу ў маслапраме.

Гэтыя факты гавораць, што гомельская райКК-РСІ не давяла сваёй справы да канца і не дабілася поўнасьцю патрэбных вынікаў.

ГАСМАН.

З лістоў рабочых і калгасьнікаў

Цягавая сіла калгасу «Зьвязда», Дутчыцкага с.-с., Мсьціслаўскага раёну, зусім не падрыхтавана да веснавой работы. Значная частка коней заморана, ня гледзячы на тое, што ў калгасе шмат кармоў. Конюхі калгасу Курзаў і Краўцоў праводзяць кулацкую лінію. Корм коням даецца вельмі позна — перад тым, як браць іх на работу. І такім чынам, коні ўвесь дзень галодныя.

Былы старшыня калгасу Віктасёў разьяжджаў на калгасных конях і спекуляваў калгасным збожжам, а вывазка лесу і торфу засталіся нявыкананымі.

Аб такім становішчы цягавай сілы калгасу ведае і сельсавет, і партячэйка. Але крытыкаваць работу Віктасёва баяцца ўсе таму, што ў яго ва многіх райарганізацыях ёсьць свакі.

Правідловы.

***

У Буда-Кашалёўскім раёне ня выконваюць пастанову партыі і ўраду аб зьберажэньні конскага пагалоўя. Загадчык канторы ЛСПО Марковіч пры дапамозе старшыні раёвыканкому **Страйніса і райсаабу Шляхценкі** адправілі Ленінграду каля 200 коней, якія можна было-б скарыстаць у часе веснавых работ. Ёсьць выпадкі, калі ветэрсанал бракуе добрых коней (калгас «Каапэратар»). Больш таго, камуніст Хімчэнка зарэзаў двух маладых коней.

За сваю злачынную дзейнасьць раённыя работнікі атрымліваюць прэмію: 500 руб. грошай, касьцюмы, папіросы і г. д. Такую агідную практыку трэба прыпыніць і вінаватых прыцягнуць да адказнасьці.

Бедняк.

***

Фабюмам швэйнай фабрыкі імя Крупскай быў спэцыяльна заказан № 9 часопісі «Работніца і калгасьніца Беларусі». Выдавецтва «Зьвязда» 6 сакавіка накіравала праз экспэдыцыйны аддзел пры друкарні імя Сталіна 100 нумароў у адрас фабрыкі. Але заказ трапіў па той аддзел пошты, які абслугоўвае шчотачную фабрыку імя Крупскай, і адтуль праз лістаносца Максімчыка і Бразгоўка—да работніц шчотачнай фабрыкі.

За такую нядбайную пастаўку, якая зрывае своечасовае выданьне часопісі, трэба прыцягнуць да адказнасьці.

РАБОЧЫ.

Ачысьціць калгас ад варожых элемэнтаў

(Ліст калгасьніка)

У калгас «Ленінскі шлях», Талачынскага раёну, пралезьлі кулакі. Былы старшыня калгасу **ЗАЙЦАЎ** і загадчык гаспадаркі — моцныя заможнікі — увесь час праводзяць у калгасе шкодніцкую лінію.

Гэтыя кулакі, у часе пасеўнай і ўборачнай кампаніі 1932 году сваёй «палітыкай» прывялі да масавага выхаду беднякоў з калгасу. Кулакі пасеялі лён і тапаплю на малаўрадлівай дрэнна апрацаванай глебе. Агульная плошча пасеву была скарочана па 8 га. Пры ўборцы 60 проц. ільнатрасты згніло і таму плян ільназагатовак па калгасу дагэтуль ня выканан. План загатовак насеньня капюшыны таксама правален. Пасеў жыта на 1933 год праведзен па-шкодніцку: замест 10 цн. на 1 га, высявалі толькі 7. За ўсе гэтыя кулацкія дзеяньні Талачынскі РКС не прыцягнуў да адказнасьці Зайцава, а накіраваў яго на вучобу ў копыскую цэнтральную аднагадовую калгасную школу. Трэба зараз-жа вярнуць яго адтуль і прыцягнуць да судовай адказнасьці.

Цягавая сіла калгасу да веснавой работы не падрыхтавана. Конюх калгасу **ЗАЙЦАЎ** (бацька былога старшыні) таксама шкодзіць. Ён жарэбную кабылу, пакрытую добрым вытворнікам, пасла на выказку лесазагатоўкі.

Троба наш калгас ачысьціць ад клясава-варожых элемэнтаў. Гэта неабходна для таго, каб з посьпехам правесьці бальшавіцкую сяўбу. Новы старшыня калгасу **ЧМУРАК** таксама не забясьпечвае бальшавіцкага кіраўніцтва падрыхтоўкай да сяўбы.

Два калгасьнікі.

З КРАІНЫ БІЗУНА І ДУБІНКІ

ФАШЫСЦКІ ТЭРОР НЯ СПЫНЯЕЦЦА

БЭРЛІН. Як паведамляе «Фолькішэр бэабахтэр», гамбурская паліцыя нібы раскрыла нелегальны камуністычны сход і арыштавала 11 прысутных на гэтым сходзе камуністаў.

З **Вюрдбургу** агенцтва «Вольфа» паведамляе аб новых масавых вобысках і арыштах 15 чалавек, якія падазраюцца ў камуністычнай дзейнасьці.

Як паведамляе «Вольф» з **Гельзэнкірхэну**, паліцыя арыштавала ў лесе 5 камуністычных актывістаў, якія «мелі намер наладзіць нелегальную нараду». Адначасова ў Гельзэнкірхэне зроблены вобыскі і арыштавана 9 камуністаў.

Згодна паведамленьня «Фосішэ цэйтунг», у вёсцы **Гепэнгейн**, каля Ворнцу, арыштавана 82 былых членаў сацыял-дэмакратычнага «жалезнага фронту».

У **Франкфурце** на-Майне арыштован рэдактар біржавога аддзелу «Франкфуртэр цэйтунг» і старшыня саюзу журналістаў Франкфурту **Ляуінгер**. Як паведамляе «Вольф», Ляуінгер арыштован за тое, што ў часе прамовы нацыянал-сацыялістскага біржавога камісара «рабіў выяваважальныя заўвагі». Бадэнскі ўрад выдаў распараджэньне аб роспуску ўсіх існуючых у **Бадэне** «маркасцкіх спартыўных і культурных арганізацый». Уся маемасьць гэтых арганізацый канфіскуецца. Распускаюцца **рабочы саюз фізкультурнікаў, рабочы саюз турыстаў, рабочы саюз харавога спяваньня, шахматны саюз міжкраёвому, МОПР'у, «саюз рабочых радыёаматараў», «саюз ахвяр імпэрыялістычнай вайны і працы» і «саюз прыяцеляў СССР».**

Вал. Мадзьведзеў

Зьверствы нямецкіх фашыстаў над зьняволенымі перавышаюць па жорсткасьці середнявяковыя катаваньні.

СЯРЭДНЯВЯКОВЫ ІНК ВІЗЫТАР: ЯКІ ЖАХ!

БАЯВЫЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ ЛОДЗІНСКІХ ТЭКСТЫЛЬШЧЫКАЎ

ВАРШАВА. 4. Згодна атрыманых з Лодзі паведамленьняў, дэманстрацыі бастуючых тэкстыльшчыкаў і сутычкі іх з паліцыяй 30 і 31 сакавіка прынялі такія вялікія разьмеры, што ўлады вымушаны былі знач на зьмяніць сваю тактыку. Паліцыя не змагла ўзяць цела забітай маладой работніцы Вайцэхоўскай і неадкладна пахаваць яго, каб упікнуць рабочых дэманстрацый у часе пахаваньня. Рабочыя натоўпамі прыходзілі разьвітвацца з ахвяраю паліцэйскага расстрэлу. Пахавальная працэсія была такой шматлюднай, што паліцыя не адважылася ўжыць зброю ў момант, калі паміж рабочымі і паліцэйскімі агентамі адбывалася сутычка.

Усеагульная забастоўка ў Беластоку

ВАРШАВА. 4. (Уласн. інфарм.). **У Беластоку абвешчана ўсеагульная забастоўка пратэсту** ў падтрыманьне барацьбы лодзінскіх і беластоцкіх тэкстыльшчыкаў. Як піша газэта «Дзеньнік Віленскі», **забастоўка ахапіла рабочых усіх галін прамысловасьці**, апрача камунальнікаў.

Суровыя кары за апублікаваньне дыплёматычнай інфармацыі

ВАШЫНГТОН, 4. Палата прадстаўнікоў у паскораным парадку прыняла законапраект, які прадугледжвае суровыя кары ў выглядзе штрафаў і турмы за апублікаваньне дыплёматычнай інфармацыі, «якая наносіць страту бясьпечнасьці і інтарэсам ПАЗШ». Да гэтага часу ў ПАЗШ не існавала такога суровага закону аб аховe дзяржаўных тайнаў.

У часе вашынгтонскай канфэрэнцыі былы экспэрт па шыфрах — Ярдлі расшыфраваў і агаласіў у ПАЗШ японскія дыплёматычныя шыфраваньні тэлеграмы. Гэта зрабіла ў Японіі моцнае ўражаньне. Цяпер паведамляюць, што новая кніга Ярдлі, выданьне якой забаронена ўрадам, выкрывала на падставе афіцыяльных дакумантаў новыя сакрэты дыплёматыі.

Супярэчнасьці ў лягеры фашызму абвастраюцца

БЭРЛІН, 4. На пасяджэньні праўленьня «зьезду германскай прамысловасьці і гандлю» старшыня зьезду **Грунд** заявіў: «Мы даваяраем ураду і ўпэўнены, што ён створыць моцную аснову для нацыянальнага жыцьця... У асабістай гутарцы я заявіў канцлеру Гітлеру, што прадстаўленыя намі прадпрыемствы прамысловасьці, гандлю, суднаходзтва, банкаў і транспарту безагаворачна выкажуць гатоўнасьць да радаснага супрацоўніцтва з урадам».

Як паведамляе «Бэрлінэр тагеблят», буйнейшы саюз цяжкой прамысловасьці Заходняй Германіі «Лянгнамфэрэйн» у мэтах супрацоўніцтва з нацыянал-сацыялістамі стварыў сумесна з кіраўніцтвам заходнягерманскай арганізацыі нацыянал-сацыялістскай партыі асобны камітэт. Далей «Бэрлінэр тагеблят» паведамляе, што зграча **Кастля** з кіраўніцтва саюзу германскай прамысловасьці **выйшлі яшчэ 5 выдатных дзеячоў Саюзу**, імён якіх газэта ня ўказвае.

Арышт ангельскага журналіста

БЭРЛІН, 4. «Вольф» паведамляе: «Арыштован ангельскі журналіст **Гетполь** за распаўсюджваньне ілжывых паведамленьняў. Паліцыя знайшла ў яго кватэры прасякнутыя варожасьцю апісаньні апошніх падзей у Германіі».

Германская народная партыя падтрымлівае Гітлера

БЭРЛІН, 4. Кіруючыя органы народнай партыі прынялі рэзалюцыю, у якой гаворыцца, што «абавязкам германскай народнай партыі зьяўляецца падтрыманьне нацыянальнага ўраду ў правядзімай ім пад кіраўніцтвам рэйхсканцлера Гітлера цяжкай рабоце».

Гітлер забясьпечвае ўрадавую большасьць у парлямантах

БЭРЛІН, 4. З прычыны поўнага выгнаньня камуністаў з усіх ляндтагаў і скарачэньня агульнай колькасьці мандатаў, за нацыянал-сацыялістамі ў некаторых ляндтагах забясьпечана абсалютная большасьць, у другіх-жа большасьць забясьпечана за імі пры падтрыманьні «чорна-белачырвонага блёку» або нацыяналістаў.

Супроць нацыянал-фашысцкага тэрору

У МІЛЬВОКІ (ПАЗШ) адбылася 25-ты сячная рабочая дэманстрацыя пратэсту супроць нацыянал-сацыялістскага тэрору. **У ТАРОНТА ВІНШЫПЭГЕ** і інш. канадзкіх гарадох, пад кіраўніцтвам яўрэйскіх буржуазных арганізацый, адбыліся шматлюдныя сходы пратэсту супроць антысэміцкіх выступленьняў у Германіі.

У ПАРЫЖУ каля 10 тысяч чалавек прысутнічала на мітынгу, арганізаваным асацыяцыяй яўрэяў — былых удзельнікаў вайны—і міжнароднай лігай барацьбы з антысэмітызмам. У рэзалюцыі мітынгу зьмяшчаюцца абавязацельствы поўнасьцю байкатаваць германскія тавары ў Францыі і ў францускіх калёніях.

У ВАРШАВЕ адбылася канфэрэнцыя аб'яднаньня яўрэйскіх гандляроў, якая прыняла пастанову аб правядзеньні байкоту германскіх тавараў яўрэйскімі гандлярамі і абмеркавала пытаньне аб байкоце германскіх партоў. Выканаўчы камітэт яўрэйскіх саюзаў зьвярнуўся да Лігі нацый, патрабуючы выступленьня Лігі супроць прасьледваньняў у Германіі.

З колаў сакратарыяту Лігі нацый, як падае «Манчэстэр Гардыян», паступае рад заяў, даказваючых, што пытаньне аб антыяўрэйскім байкоце ў Германіі можа быць пастаўлена перад радай Лігі нацый на падставе 2 артыкулу статуту Лігі.

У Францыі абвешчана ўсеагульная забастоўка гарнякоў

ПАРЫЖ, 4 (ТАСС). Усеагульная забастоўка гарнякоў ахапіла поўнасьцю **ўсе паўднёвыя вугальныя басэйны. У паўночных раёнах забастоўка** застаецца частковай. Лідэры рэфармісцкіх прафсаюзаў адхілілі прапанову унітарных прафсаюзаў аб сумеснай арганізацыі пікетаваньня.

Ня гледзячы на гэта, у вугальным басэйне **Анзон** забаставаўшыя рабочыя—члены рэфармісцкага саюзу гарнякоў і унітарнага саюзу гарнякоў—расставілі забастовачныя пікеты і дабіліся ўцягненьня ў забастоўку амаль усіх рабочых.

Паліцыя арыштавала тут трох работнікаў унітарнага прафсаюзу, у тым ліку і сакратара унітарнага прафсаюзу басэйну **Анжэн. У паўночным басэйне Дуз ў Эскарпель** забастовачны рух, дзякуючы дзейнасьці унітарных прафсаюзаў, **ахапіў сто процантаў рабочых.** У Мантыньі-Ан-Гоель гарнякі наладзілі дэманстрацыю і ак ружылі шахты, але былі разагнаны паліцыяй.

У басэйнах **Луары, Авэйрона і Гар** усе руднікі ўчора стаялі. У **Эроль** забастоўка была ўсеагульнай. У басэйне **Грэсасак** тое-ж самае. У **Алье** забастоўка ўсеагульная.

У іншых раёнах усеагульная забастоўка была сарвана штрэйкбрэхэрскай тактыкай рэфармісцкага саюзу і яго адмаўленьнем выступіць сумесна з унітарным прафсаюзам.

Паведамленьне ТАСС

МАСКВА, 4. Згодна пастановы пракурора Вярхоўнага суда ад 22 сакавіка, прыцягнутыя да справы аб шкодніцтве грамадзяне Грэгоры і Кушнетарытон вызвалены пад грашовы залог, унесены фірмай «Мэтрапалітэн Вікерс» 4 красавіка. Ад вызваленых узята падпіска аб нявыезьдзе і яўцы ў суд.

АДКРЫЦЬЦЕ САВЕЦКАЙ ВЫСТАЎКІ У ПАРЫЖЫ

МАСКВА, 4. (БЕЛТА). Гэтымі днямі ў Парыжы ў памяшканьні педагагічнага музэю міністэрства асьветы была адкрыта францускім таварыствам зблiжэньня з СССР выстаўка «Асьвета ў Савецкім саюзе», адпраўленая ў Францыю ўсесаюзным таварыствам культурнай сувязі з заграніцай. Выстаўку адкрыў член таварыства зблiжэньня з СССР праф. Лянжэван. Выстаўка карыстаецца вялікім посьпехам. З Парыжу яна будзе пераплнута ў іншыя гарады Францыі.

У Брусэлі гэтымі днямі адкрыта бэльгійскім таварыствам зблiжэньня выстаўка «Жанчына і дзеці ў СССР». Выстаўка складаецца з плякатаў, літаратуры і дыяграм

АДРЫЯТЫЧНЫЯ СУПЯРЭЧНАСЬЦІ—ПАГРОЗА ВАЙНЫ

Італьянская дыплёматыя праяўляе ўзмоцненую актыўнасьць. За апошнія месяцы Мусаліні прыкладае ўсе намаганьні, каб высунуць Італію на авансцэну эўрапэйскай палітыкі. Пры ход да ўлады ў Германіі Гітлера натхняе «правадыра» італьянскага фашызму, які ў асобе Гітлера бачыць свайго пасьлядоўцу і — чаму-б не? —магчымага саюзьніка. Адразу-ж пры зьяўленьні на чале ўлады ў Германіі Гітлера, у эўрапэйскім друку ўзмоцнена сталі гаварыць аб італа-германскім зблiжэньні, аб італа-германскім альянсе. Ня гледзячы на тое, што італьянскі ўрад афіцыяльна абвяргаў паведамленьні аб італа-германскім ваенным саюзе, тым ня менш ні ў Італіі, ні ў Германіі не адмаўляюць таго факту, што сваяцтва палітычных рэжымаў Германіі і Італіі спрыяе некаторараму «натуральнаму» зблiжэньню паміж гэтымі дзьвюма краінамі адкрытай фашысцкай дыктатуры.

Якавы тыя непасрэдныя задачы, што ставіць сабе зараз фашысцкая Італія ў сваёй палітыцы зблiжэньня з Германіяй Гітлера?

Як вядома, асноўным стрыжнем італьянскай замежнай палітыкі зьяўляецца італа-францускі антаганізм. Малады і параўнаўча слабенькі італьянскі імпэрыялізм усюды, дзе ён імкнецца ажыцьцявіць сваю экспансію, сустракаецца з францускім імпэрыялізмам, які апіраецца на вялізарную ваенна-тэхнічную і фінансавую магутнасьць. У Афрыцы ўсе спробы італьянскага імпэрыялізму пашырыць калёніяльныя ўладаньні Італіі пяюменна разьбіваліся аб супраціўленьне Францыі, і Італіі дасталіся ў Афрыцы толькі такія вобласьці, як Трыпалітанія, Кірэнаіка, Эрытрэя і Сомалі, якія толькі кладуцца цяжарам на дзяржаўны бюджэт. На Бальканах і ў паўднёва-ўсходняй Эўропе, дзе Італія імкнецца ўмацаваць свой эканамічны і палітычны ўплыў, яна зноў такі натыкаецца на пасьпяховае процідзеяньне Францыі. Як вядома, Італія ўступіла ў вайну з Германіяй у маі 1915 году на баку Антанты толькі пасьля таго, як у красавіку 1915 г. у Лёндане дзяржавы Антанты падпісалі з Італіяй патаемны дагавор, згодна якога Італіі было абяцана ў выпадку перамогі ўсё Далмацкае ўзьбярэжжа Адрыятычнага мора. Аднак, пры заключэньні Вэрсальскага міру Францыя правяла стварэньне Югаслаўскай дзяржавы за кошт Сэрбіі, Чарнагорыі і ўсяго далмацкага ўзьбярэжжа. Гэтай «крыўды» ніяк ня могуць даравацъ Францыі італьянскія імпэрыялісты.

З таго часу, як у 1922 годзе Мусаліні прыйшоў да ўлады ў Італіі, заслінеі прыйшоў да ўлады ў Італіі, замежная палітыка апошняй разьвіваецца пад знакам бязупынных трэньняў і канфліктаў з Югаславіяй. Нярэдка адносіны паміж гэтымі краінамі дасягаюць такога абвастрэньня, што з абодвух бакоў чуецца бразганьне зброяй і ўвесь эўрапэйскі друк пачынае гаварыць аб небясьпецы вайны на Адрыятыцы. Югаславіч, якая апіраецца на падтрыманьне Францыі, уладаючы, дзякуючы гэтаму падтрыманьню, усходнім узьбярэжжам Адрыятычнага мора, зьяўляецца бяльмом на воку італьянскага імпэрыялізму. Італьянскі ўрад і італьянскае ваеннае камандаваньне ня можа ні на мінуту выпусьціць з-пад увагі таго факту, што ў выпадку вайны з Францыяй, Італія будзе адкрыта для ўдару з флянгу з боку Югаславіі. Такім чынам, у той час, як Тырэнскае ўзьбярэжжа Італіі падпадзе небясьпецы з боку францускага флёту, Адрыятычнае яе ўзьбярэжжа будзе знаходзіцца пад ударам з боку ўзброеных сіл саюзьніка Францыі — Югаславіі.

Вось чаму асноўнай задачай італьянскага імпэрыялізму ў яго барацьбе з францускім імпэрыялізмам зьяўляецца аслабленьне Югаславіі. Для ажыцьцяўленьня гэтай задачы італьянскі імпэрыялізм імкнецца дзейнічаць двума мэтадамі. Адзін мэтад заключаецца ў дыплёматычным акружэньні Югаславіі. Італія падтрымлівае рэваншысцкія імкненьні ў Вэнгрыі, абяцаючы вэнгерскім нацыяналістам зварот Вэнгрыі далучаных да Югаславіі абласьцей Ваната, Босніі і інш. Італія падтрымлівае таксама прыяцельскія адносіны з Балгарыяй, граючы на балгара-югаслаўскіх супярэчнасьцях і абяцаючы Балгарыі падтрыманьне ў адабраньні далучанай да Югаславіі часткі Македоніі. Італія выкарыстоўвае таксама супярэчнасьці паміж Грэцыяй і Югаславіяй па пытаньні аб Салонінскім порце і аб чыгунцы Гейгелі — Салонікі. Італія ператварыла суседнюю з Юга-славіяй Альбанію ў італьянскую калёнію, асноўным прызначэньнем якой, паводле плянаў італьянскага штабу, зьяўляецца: служыць пляцдармам для нападу на Югаславію.

Другім мэтадам, пры дапамозе якога фашысцкая Італія імкнецца да аслабленьня Югаславіі, зьяўляецца мэтад раздробленьня. Італія імкнецца скарыстаць учутраныя супярэчнасьці, разьдзіраючыя «Каралеўства сэрбаў, харватаў і славен», дзе харвацкая, славенская, вэнгерская і інш. нацыянальная меншасьць падпадаюць жорсткай эксплёатацыі з боку сэрбскай ваенна-фэадальнай эліты. У прыватнасьці, Італія ўсяляк падтрымлівае харвацкі сэпаратысцкі рух, дабіваючыся падзелу Югаславіі на некалькі пробных незалежных дзяржаў. Такім чынам, італьянскі імпэрыялізм разьлічвае ажыцьцявіць свае адвечныя мары — захват Далматыі і ператварэньне Адрыятычнага мора ў «італьянскае возера».

Але ўрад Мусаліні добра ўяўляе сабе тое, што пасьпяховае правядзеньне сваіх плянаў ніяк немагчыма без падтрыманьня і цеснага супрацоўніцтва хаця-б адной з буйных эўрапэйскіх дзяржаў. У абвастрэньні франка-германскіх супярэчнасьцяй, якія дасягнулі выключна вялікага напружаньня пасьля прыходу да ўлады Гітлера, Мусаліні бачыць вельмі спрыяючую прадпасылку для ўмацаваньня італа - германскага супрацоўніцтва. Яшчэ ў кастрычніку мінулага году Мусаліні высунуў ідэю «дырэкторыі чатырох дзяржаў», якая зараз сустрэла спачуваньне і з боку Макданальда. Паводле думкі Мусаліні, стварэньне «дырэкторыі чатырох» прадстаўляе для Італіі рад важных пераваг. Папершае, гэта азначае ўмацаваньне прэстыжу Італіі па-за яе межамі, а таксама ўмацаваньне вельмі падмочанага ў выніку шматгадовага эканамічнага крызісу становішча італьянскага ўраду ўнутры краіны. Па-другое, унутры «дырэкторыі» Італія разьлічвае атрымаць магчымасьць актыўна выкарыстаць супярэчнасьці паміж Германіяй і Францыяй і паміж Францыяй і Англіяй. Гэтыя замыслы італьянскай дыплёматыі зусім відавочны для Францыі, якая рашуча выказалася супроць «дырэкторыі».

Не падлягае сумненьню, што няўдача праекту стварэньня «дырэкторыі чатырох» ня спыніць далейшых намаганьняў Італіі да забесьпячэньня сваёй гегемоніі ў Адрыятыцы, якая з кожным днём усё больш і больш становіцца адным з самых актыўных вогнішчаў небясьпекі новай вайны.

П. Андроўскі.

ПАДРЫХТОЎКА ДА СЬВЯТКАВАНЬНЯ 1-га МАЯ

Для правядзеньня першамайскага сьвята Менскі гарсавет выпучыў камісію ў складзе т. т. Бешмачнікава (старшыня), Кудзелька, Каранеўскага, Шуплякіна, Кавалёва, Палічанскага, Гершона і інш.

Камісіі прапанавана прадставіць у бліжэйшыя дні падрабязны плян сьвяткаваньня па горадзе і раёне.

Абвешчан конкурс на складаньне праекту па афармленьні пляцоў і скверaў гораду.

Гарпляну даручана распрацаваць рад практычных мерапрыемстваў па дабраўпарадкаваньню гораду з тым, каб гэтыя работы былі скончаны да 1-га мая.

* * *

Да першамайскага сьвята менская інспэктура аховы здароўя разгортвае сетку дзіцячых камбінатаў—пляцовак і ясьляй на палёх. У калгасах будзе адкрыта 100 пляцовак і ясьляй, у саўгасах—24. Частка з іх пачне функцыянаваць з сярэдзіны красавіка.

Інспэктура аховы здароўя праводзіць курсы па падрыхтоўцы кадраў для дзіцячых устаноў у калгасах і саўгасах. Усяго падрыхтоўваецца 75 работнікаў з пепшых калгасьніц-ударніц.

На гэту мэту адпушчана 125 тыс. руб. Акрамя таго, для патрэб ясьляй і пляцовак, ужо вызначана каля 13 тыс. мэтраў мануфактуры.

Паведамленьні

ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 10, 11, 12 красавіка г. г., а 10 гадз. раніцы, у г. Масыры будзе працаваць выязная ПТ ЦКК КП(б)Б па разгляду партпрацы Мазырскага, Ельскага і Наваўлянскага раёнаў.

Па Ельскім раёне на 10-IV г. г., у 10 гадз. раніцы намі выклікаюцца наступныя т. т.: Прышчанка І. Г., Жураўкоў А. Ц., Гаўрылаў В. С., Трошка П. М., Суровы Ф. Д., Спасенка М. А., Мулярэ Г. А., Здрок К. Я., Коцік М. Н., Балтайчук А. Е., Рабчынскі Д. А., Коцель К. А., Ласка М.

Па Наваўлянскім раёне на 10-IV—33 году ў 10 гадз. раніцы: Ляльчук І. В., Альхавік М. Я., Бронсвіч В. І., Ялчанка Х. І., Камісарчык Г. М., Сычаў А. Я., Шоран Ц. Х., Рэнца Л. К.

Па Мазырскім раёне на 11 і 12-IV—1933 г. у 10 гадз. раніцы: Лапіцкі М. Г., Рубанік А. Г., Разумоўскі М. І., Кавалёнка С. Л., Белацаркоўскі Н. Г., Сьцепанюк Р. І., Каўлоўскі А. Я., Фінкельштэйн Г. Ш., Тарасенко Р. Л., Гаралава А. П., Заіцкі З. Л., Голад П. А., Ляўкоўскі А. І., Рубанік, Куцапалаў Н. Л., Кошпер П. М., Яцко М. З., Шаткоўскі Р. П., Конаш Е. А., Голубеў В. І., Кукко М. П., Навумчык Х. Я., Масашонак В. Р., Самук Х., Процько М. Г., Бунова Я., Малінкоўскі А. Р., Будзёны Р. М., Старакойтаў В. П., Вінакураў Н. Ф., Бельчыкаў І. І., Шкляр В. А., Міндзін А., Лапушкіна П. П., Швец Х. З., Ганчар Ц. П., Кацман М. Ф., Кірпічнікаў Ф. С., Цімашенка М. Ф., Навумчык Х. Я., Меерзон Н. С., Руткоўскі С. А., Заранкоўскі Ф. І., Баерман С. А., Пунцус Х. А., Куччык В. Ц., Лісіменкаі С. П., Ясковец Я. А., Міронаў К. Н., Дыканенка В. Х., Пскуноў П. І., Кастянчык Я., Лапкоў П. Р., Ліакумовіч Б., Вайсман Ш. А., Прыходзька У., Бандарэнка В., Шэйман І. Ш. Чыгірава Т. В., Рудніцкі А. Ф., Шаламовіч А. Н., Босін, Буланова С. В., Каменскі Х. А., Эвенкоў Д. Р.

ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 11 і 12 красавіка г. г., а 10 гадз. раніцы, у г. Воршы будзе працаваць выязная ПТ ЦКК КП(б)Б па разгляду партпрацы Дубровенскага, Горацкага і Сеньненскага раёнаў. Намі выклікаюцца наступныя т. т.:

На 11-IV—33 г. у Воршы — Дубровенскі раён: Амельчанка У. Н., Вайнэр А. Р., Вішік, Малінкоўскі А. Г., Васюковіч С. С., Мірончык В. М., Сільчоўскі З. П., Пінзбург Е. Н., Чаркуцін О., Ліхадзіеўскі С., Бецалеў А. П., Цыліх Е. Д., Калачко Ц. П., Швец М., Садноў П. А., Сыдлянчык С. А., Вітковскі.

На 11-IV—33 г. у г. Воршы — Сеньненскі раён: Горнак Л. Т., Астапенка Ц. М., Лапуноў Дз., Папушкін Е. Д., Кавалеўскі Е. С., Васілеўскі Б. С., Бельскі Я. Я.

На 12-IV—33 г. у г. Воршы — Горацкі раён: Арыйчак Ц. С., Дзаранкоўскі М., Сьвірыш А. С., Бракераў В. П., Сафуліч В. І., Бароўка Л. Я., Сокалаў Вас., Ганцуноў С. С., Атрашонак В. Н., Голаў Як., Мельнікаў П. А., Шапалаў В. Я., Жаркоўскі П., Іваноў Я. М., Дзенісенка Р., Гіткоў А., Малін А. В., Сабалеўскі М. І., Тарасаў М. І., Гурэвіч У. А., Мантапёў Р. В., Опутараў А., Гарохаў М. Я., Астапенка Т. Н.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Першы Дзяржаўны Тэатр (БДТ-1)
Маст. кіраўн. ЛІТВІНАЎ.
СЁНЬНЯ Л. і П. Тур.
ЗЯМЛЯ І НЕБА
п'еса ў 4-х дзеях.
Пачатак у 8 гадз.

Чырв. Зорка Каса—ад 1 г. дня. Новы гукавы фільм КАІН І АРЦЁМ
Дзіцячы гукавы КІНО-ТЭАТР Каса з 12 г. дня. З 1 красавіка новы мастацкі фільм РАЗАМ з БАЦЬКАМІ
„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" КАСА—ад 2 г. дня Усходні мастацкі фільм ДВА ПАЛЯЎНІЧЫЯ
ПРАЛЕТАРЫ Мастацкі фільм КНЯЗЕЎНА МЭРЫ драма ў 8 ч.
„СПАРТАК" Каса з 2 г. 30 м. дня Выдатны фільм ПАЛАЧЫ драма ў 8 частках

Клічаўская контора Белплодагароднінa
ЛІКВІДУЕЦЦА
з 30-3-33 г.
Претэнзіі ліквідкомам будуць прымацца да 12 красавіка 1933 г.
Адрас ліквідкому: м. Клічаў, БССР,
Ліквідком.

Рэдакцыі газэты „ЗЬВЯЗДА"
ПАТРЭБНЫ
кваліфікаваны машыністкі,
Зварачацца: Савецкая, 62, 3-ці паверх.

Для фак-ту НАРКАСВУЧОТУ пры плянава-эканам. інстытуце
СЭКТАР КАДРАЎ ВОСУ
арганізуе
2 групы 4-мес. падрыхтоўчых курсаў
(1 група без адрыву ад вытворчасьці).
Частка курсантаў забясьпечваецца стыпендыяй. Інтэрнатам не забясьпечваюцца.
Заявы з дакумантамі: аб сац. паходжаньні і становішчы, аб узросьце, аб адукацыі (ня менш 8 груп або 7-годка з дадатковай самаадукацыяй) і заверэная анкета прымаюцца
да 12 красавіка
ў канцылярыі ВОСУ
(Менск, Камуністычная, 16, пан. № 10) ад 12 да 2 гадз.

Беларускае Аддзяленьне „ДАМЭЦ"
даводзіць да ведама ўсіх фабзавкомаў, МОСІКОМАЎ і іншых зацікаўленых арганізацый,
ШТО
з 10 красавіка г. г.
ПРЫМАЮЦЦА заяўкі
НА ПРАДМЕТ АБСЛУГОЎВАНЬНЯ
МАЙСКІХ ДЗЁН
ПАЛІТЭТРАЭТРАДНЫХІ ВЫСТУПЛЕНЬНЯЎ АРТЫСТАЎ ЛЕНІНГРАДЗКАГА „ДАМЭЦ"у.
Прыпадпісаньні дагавору вышэйуказаных арганізацый павінны забясьпечыць свае прадстаўнікоў даверанасьцю на права падпісаньня дагавору.
Заяўкі прымаюцца штодзенна з 10 да 4 г. 30 м.
АДРАС: Універсытэцкая, 12, клюб мэтаністаў, тэл. № 22—756.
БЕЛДАМЭЦ.

МЕНГАРЗДРАЎ
з 4 красавіка 1933 г. абвяшчае
перарэгістрацыю
ўсіх дактароў,
ЗУБНЫХ ДАКТАРОЎ, ФАРМАЦЭЎТАЎ, МЭДСЯСЬЦЁР, ЛЕКПОМАЎ І АКУШОРАК.
Рэгістрацыя будзе праводзіцца ў памяшканьні Гарздраву (Пляц Волі, 4, 2-гі паверх, пакой 27)
4-га КРАСАВІКА 1933 года . . . А, Б, В, Г, Д—з 18 да 22 гадз.
5 . . . . . Е, Ж, З, І —з 18 да 22 гадз.
6 . . . . . К, Л, М, Н, О, П, Р—з 10 да 15 і з 18 да 22 гадз.
7 . . . . . Усе астатнія —з 18 да 22 гадз.
Пры перарэгістрацыі неабходна абавязкова мець дыплём і вайсковы білет. Праходзячыя перарэгістрацыю атрымліваюць ад Гарздраву адпаведную даведку.
Тыя, што не перарэгіструюцца, з 10-га красавіка г. г., да працы дапушчаны НЯ БУДУЦЬ.
МЕНГАРЗДРАЎ.

СЬПІС № 4
Беларуская Кантора Дзяржаўнага Банку,
згодна пастановы СПА ад 20-IV—1932 г.
аб парадку рэгістрацыі неплатаздольных 1 ня спраўных гаспадарчых органаў,
АБВЯШЧАЕ АБ НЕПЛАТАЗДОЛЬНАСЬЦІ
НАСТУПНЫХ ГАСПАДАРЧЫХ ОРГАНАЎ:
1. Сіроцінскі Райспажыўсаюз — Неаплата рахункаў.
2. Торфабкоп імя Даўмана — „
3. Калінкавіцкая Міжрайбаза БКС — „
4. Мазырскае Міжрайённае Аддзяленьне Белгандлю — Мазыр — „
5. Мазырская Райнасенкантора — Мазыр — За сыстэматычную пратэрміновую пазыку
6. Калінкавіцкая арцель „Ясень" — м. Шуміліна — За неаплату штатных пазыкі
7. Калінкавіцкая арцель „Зорка" — ст. Оболь — „
8. Азарыцкая арцель „Надзея" — Калінкавічы — „
Калінкавічы — „
Азарычы. Мазырск. раёну — „
БЕЛКАНТОРА ДЗЯРЖБАНКУ.

Рэдакцыя газэты „ЗЬВЯЗДА"
9 КРАСАВІКА СКЛІКАЕ
НАРАДУ АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА БУДАЎНІЧАГА СЗЗОНУ
На нараду павінны зьявіцца з падрыхтаванымі матар'яламі: кіраўнікі або іх намесьнікі: Белдзяржбуду, будканторы Дзяржплану, Белбудматар'ялу, будканторы пры Беднылсаюзе, будсэктару Камунбанку, дырэктары менскіх цэгелень і рэдактары шматтыражак і насьценгазэт памянёных устаноў.
Нарада адбудзецца 9-IV—33 г. а 6 гадз., у памяшканьні рэдакцыі. (Савецкая, 63, 3-ці паверх, прамысловы сэктар).

Трэсту БЕЛДЗЯРЖКІНО
ПАТРЭБНЫ ДЛЯ СТАЛАЙ ПРАЦЫ:
ГАЛОЎНЫ БУХГАЛЬТАР,
СТАРШЫЯ БУХГАЛЬТАРЫ
БУХГАЛЬТАРЫ,
ПАМ. БУХГАЛЬТАРОЎ,
ТЭХ. САКРАТАР.
З прапановамі зварачацца:
г. Менск, Савецкая 90, 2-гі паверх.

У сувязі з неаплатай рахункаў і пратэрміноўкай пазык
Ельскае аддзяленьне Дзяржбанку
ПРАДАЕ тавары
наступных арганізацый:
1. ЕЛЬСКАГА РАЙСАЮЗУ.
Галаўныя ўборы . . . на 2380 руб.
Мануфактуру . . . „ 260 „
Гатовую вопратку . . . „ 3500 „
Трыкатаж . . . „ 910 „
Галантарэя (розная) . . . „ 6900 „
Абутак . . . „ 100 „
Гузікі . . . „ 2875 „
Ніткі—катушкі . . . „ 7225 „
Жал. скабян. вырабы . . . „ 1440 „
Гаспадарч. прадметы . . . „ 15130 „
Вата . . . „ 2500 „
Мэбля . . . „ 3520 „
Кроўчатнікі стандартныя . . . „ 800 „
Канц. прылады, папера . . . „ 10000 „
Падручнікі, літаратура . . . „ 10000 „
2. ЦАГЕЛЬНАЙ АРЦЕЛІ „БУДАЎНІК".
— Цэглу на 4100 руб. —
Зварачацца ў Ельскае аддзяленьне Дзяржбанку.
Ельскае адд. Дзяржбанку.

12-га красавіка г. г.
склікаецца
III ПЛЕНУМ ЦЭНТРАЛЬНАГА САВЕТУ ПРАФСАЮЗАЎ БЕЛАРУСІ.
ПАРАДАК ДНЯ:
1. Аб удзеле прафсаюзаў у падрыхтоўцы 1 правядзеньні весьняной сяўбы.
2. Папярэднія вынікі перазаключэньня калдагавораў.
3. Арганізацыйныя пытаньні.
Старшыня Цэнтральнага савету прафсаюзаў Беларусі
КАВАЛЬЧУК.

ПРАВЯРАЙЦЕ свае білеты!
АТРЫМАЙЦЕ свае выйгрышы!
ЦЭНТРАЛЬНЫ САВЕТ САЮЗУ АСОАВІЯХІМ СССР
разасла́ў усім сваім арганізацыям і вышэйшасам зводную табліцу выйгрышаў 6-й усесаюзнай лятарэі (з 1-га па 6-ы разрад уключна) і па білетах імя III пленуму ЦС.
Апрача таго, для ведамя трымальнікаў паведамляецца, што тыражныя таблiцы (з 7-га па 21-ы разрад і білетах імя III пленуму ЦС) публікаваліся Цэнтральным Саветам Саюзу Асоавіяхім СССР у наступных газэтах:

„Экономическая жизнь"		„Известия ЦИК СССР и ВЦИК"	
7-га разраду	28-XII—32 г.	8-га разраду	23-X —32 г.
11-га „	8-II —33 „	9-га „	29-IX —32 „
12-га „	5-I —33 „	10-га „	23-X —32 „
14-га „	2-I —33 „	13-га „	28-VIII—32 „
15-га „	16-II —32 „	16-га „	29-IX —32 „
17-га „	17-I —33 „	18-га „	17-X —32 „
19-га „	8-II —33 „	23-га „	13-XI —32 „
20-га „	9-I —33 „	24-га „	25-XI —32 „
21-га „	2-II —33 „	31-га „	16-X —32 „
22-га „	28-XII —32 „	32-га „	15-XII —32 „
25-га „	22-I —33 „	33-га „	28-VIII —32 „
26-га „	6-I —33 „		
27-га „	4-II —33 „		
28-га „	11-II —33 „		
29-га „	1-XII —32 „		
30-га „	14-II —33 „		
34-га „	4-I —33 „		

БІЛЕТЫ імя III ПЛЕНУМУ ЦС у ГАЗЭТАХ,
„Экономическая жизнь" ад 23-XII—32 г.
„Красная звезда" ад 28-XII—32 г.
„Изв. ЦИК СССР и ВЦИК" ад 3-I—33 г.
Згодна сумеснага ўказаньня намесьніка начальніка галоўнага кіраўніцтва Дзяржпрацашчадкасы і дзяржкрэдыту т. Бейлінсона і намесьніка старшыні ЦС Саюзу Асоавіяхім СССР у Беларускай—усе дзяржпрацашчадкасы, а таксама і рэспубліканскія, краёвыя, акруговыя і раённыя Саветы Асоавіяхіму выплацяць грашовыя выйгрышы ад 10 руб. да 100 руб. уключна да 31-га сьнежня 1933 году.
Выйгрышы звыш 100 рублёў выплачваюцца да скончаньня ўказанага тэрміну выключна ЦС Саюзу Асоавіяхім СССР—Масква, Нікольская, 27.
Плянава-фінансавы аддзел Саюзу Асоавіяхім СССР.

Менск, друкарня «Зьвязды». Галоўлітбел № 337.